

ДАВЕДАЦЦА ПРА ЧУЖЫЯ ДАЎГІ 11



НЯЗВЕДАНАЯ, ЗАГАДКАВАЯ ВУЗКАКАЛЕЙКА 13

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

17 ЖНІЎНЯ 2021 г. АЎТОРАК № 156 (29525)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Ігар КАРПЕНКА, міністр адукацыі:**

*«Ужо прыкладна 50 % устаноў агульнай сярэдняй адукацыі атрымалі сертыфікаты. Працэс ідзе. Дзесьці праходзяць планавыя рамонты, недзе закупляецца неабходнае абсталяванне, мэбля. Сёлета мы плануем адкрыць сем новых школ. Дзве з іх у Мінску. Акрамя таго, цяпер фактычна завяршаем аснашчэнне нашых школ неабходным абсталяваннем, метадычнымі рэкамендацыямі, падручнікамі. За парты 1 верасня сядуць 1 мільён 85 тысяч школьнікаў. З іх — 118 тысяч першакласнікаў. Гэта прыкладна на тры тысячы больш, чым летась».*

# Кніжны рай




**Адзіная ў нашай краіне прыватная, заснаваная на даверных адносінах, бібліятэка не першы год дзейнічае на Случчыне, а менавіта ў вёсцы Бязверхавічы. У бібліятэцы больш за тры тысячы экзэмпляраў кніг і часопісаў, ахвяраваных рознымі людзьмі. Без перабольшання, установу можна назваць грамадска-публічнай, хоць яна займае па плошчы звычайны гандлёвы шапік.**

Чым яшчэ адрозніваецца бязверхавіцкая бібліятэка ад іншых устаноў гэтага профілю? Тым, што тут... няма бібліятэкара, а таксама адсутнічаюць іншыя абанементныя фармальнасці. Усё дэмакратычна: чытач сам выбірае чытво і бярэ з сабою кніжак столькі, колькі захоча. Але ўсе трымаюцца негалоснага правіла: прачытаў кнігу — вярні назад. А яшчэ ва ўстановы ёсць персанальная назва «Бібліятэка ў Сафіі».

— Сафія — мая старэйшая ўнучка, у гонар яе і назваў бібліятэчны праект. Дзяўчынцы цяпер чатырнаццаць гадоў, яна жыве ў сталіцы, а летам гасцюе ў Бязверхавічах і глядзіць бібліятэку, — распавёў мне аўтар праекта падпалкоўнік у адстаўцы Леанід ГАПАНОВІЧ. — Я даўно выношваў ідэю стварэння невялікай бібліятэкі, бо і дагэтуль люблю чытаць і хачу, каб землякі таксама праводзілі час за чытвом.

Высакародная ідэя вылілася ў змястоўны адукацыйны праект, а бібліятэка стала неад'емнай часткай жыцця сучаснай вёскі.

На здымку — жыхаркі вёскі Іванаўскія Агароднікі Бажэна САКАЛОЎСКАЯ і Ганна ПЯЧКОЎСКАЯ, якія спецыяльна прыехалі наведаць бязверхавіцкі «кніжны рай».

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

## КОРАТКА

- **Міліцыя Мінска правядзе мерапрыемствы па папярэджанні супрацьпраўных паводзін грамадзян.**
- Міні-кірмашы вакансій правядуць у Мінску 17 і 18 жніўня.
- **У Брэсце выкладчык атрымаў тры гады «хатняй хіміі» за хабар.**
- У Камянецкім раёне вясковец у лесе знайшоў авіяцыйную бомбу часоў Вялікай Айчыннай вайны.
- **Белтэлерадыёкампанія распачала здымкі прэм'ернага музычнага шоу-праекта «X-Factor у Беларусі».**



- За І паўгоддзе замежныя інвестары ўклалі ў эканоміку Віцебскай вобласці больш за $383 мільёны.

ISSN 1990 — 763X
21156
9 771990 763008

Камунальныя стасункі

# РЫХТУЙ ДРОВЫ І ПРАВАДЫ ЛЕТАМ

## Што робяць камунальнікі, энергетыкі і газавікі ў чаканні зімы



**Прамыўка водаправодаў і каналізацыі, замена цепласетак, рамонт артэзіянскіх свідравін, помпаў і электрасетак, назапашванне паліва (у тым ліку рэзерву паліўнага мазуту ў 364 800 тон, што дазволіць 16 дзён працаваць, калі пастаўкі газу раптам будуць абмежаваны), праверка газаправодаў, расчыстка прасек, замена правадоў... Пра гэтыя і іншыя мерапрыемствы, закліканыя стварыць беларусам утульную зіму ў дамах, расказалі эксперты жыллёва-камунальнай і энергетычнай галін краіны.**

СТАР. 7

Нечаканыя «суседзі»

# ГОСЦІ З ЛЕСУ

## Мядзведзі, зубры, рысі ўсё часцей з'яўляюцца на падворках беларусаў

**Апошнім часам (звычайна гэта бывае ў канцы вясны або лета) у сродках масавай інфармацыі ўсё часцей сустракаюцца паведамленні аб з'яўленні дзікіх жывёл на вуліцах населеных пунктаў — хутароў, вёсак, нават райцэнтраў. Як нярэдка аказваецца, не заўсёды такія «візіты» лясных насельнікаў бываюць бяскрыўднымі для людзей. А часам яны з'яўляюцца самай сапраўднай пагрозай для жыцця чалавека. Звычайна гаворка ў такіх выпадках ідзе пра ліс, дзікоў, тхароў, часам ваўкоў. Яно і не дзіўна: у гэтых драпежнікаў падрастае патомства, і яго трэба навучыць правілам палявання і здабывання ежы. Паколькі многія сельскія населеныя пункты становяцца малалюднымі, то і адчуваюць сябе лясныя госці дастаткова ўпэўнена. Ад гэтага церпяць людскія гаспадаркі: знікаюць з падворкаў авечкі, птушкі — куры, нават гусі. Ды і сабакам дастаецца. Яшчэ большую пагрозу нясуць хворыя на шаленства жывёлы. Такія могуць напасці і на чалавека, бо перастаюць баяцца людзей.
Але сёння мы хацелі б пагутарыць не пра гэтых візіцёраў...**

СТАР. 5

З першых вуснаў

# «З'ЯЎЛЯЕМСЯ ТРАНЗІТНАЙ КРАІНАЙ, ТАМУ АБАВЯЗАНЫ ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ НАРМАЛЬНАЕ ФУНКЦЫЯНАВАННЕ ТРАНСПАРТУ»

**Аб сітуацыі ў транспартным комплексе Прэзідэнту Беларусі Аляксандру Лукашэнку далажылі намеснік прэм'ер-міністра Анатоль Сівак і профільны міністр Аляксей Аўраменка.**

Прэзідэнт адзначыў: дастаткова добра ведае стан спраў у галіне, таму слухаць заяўлены першым даклад «Аб значнасці транспартнага комплексу ў сацыяльна-эканамічным развіцці краіны» яму няма неабходнасці.

«Калі ласка, не трэба аб значнасці. Я не першы год працую Прэзідэнтам і ведаю, што такое транспартны комплекс і яго значэнне ў сацыяльна-эканамічным развіцці краіны. Гэта прэссакратару і Адміністрацыі Прэзідэнта раскажаце, калі яны не валодаюць гэтым пытаннем», — заўважыў кіраўнік краіны.

Прэзідэнт канстатаваў, што больш яго хвалююць пытанні, якія на першым плане ў прысутных чыноўнікаў.

«Мяне хвалююць і непакояць пытанні, што хвалююць вас. Пачынаючы ад «Белавія», калі гэтыя вар'яты пачалі душыць нашу кампанію (цяпер усе ўжо зразумела, чаму)? Ну і ў цэлым, як жыве наш транспарт і ўвесь транспартны комплекс», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Па словах Прэзідэнта, з паслуг, якія аказвае дзяржава, амаль палову займае транспартная сфера. Транспарт сёння фарміруе амаль палову валютнай выручкі ад экспарту паслуг — 2,3 мільярда долараў.

«Гэта велізарныя маштабы. Велізарная сума. Мы транзітная краіна. Я нават не хачу паглыбляцца ў праблему санкцый, якія адносяцца да вас. З'яўляемся транзітнай краінай, таму вы проста абавязаны забяспечыць нармальнае функцыянаванне транспарту», — заявіў Прэзідэнт.

Ён дадаў, збоі магчымыя, але яны павінны быць кароткатэрміновыя.

«Усе мы разумелі, што яны нас у спакоі не пакінуць, а будуць гэтымі санкцыямі душыць. Як складваецца зараз сітуацыя, калі ёсць нейкія праблемы? Якія шляхі выхаду з гэтага стану вы бачыце?» — задаў пытанні дзяржслужачым Аляксандр Лукашэнка.

Яшчэ адна тэма, якая на парадку размовы, — будаўніцтва дарог. Тут кіраўніка краіны цікавіць, якія дарогі будуем, які стан у мясцовых дарог. З гэтымі пытаннямі Прэзідэнт звярнуўся да Анатоля Сівака.

«Мабыць, Анатоль Аляксандравіч, табе гэта тэма бліжэйшая, бо ты ўсё жыццё будаваў дарогі і ведаеш усе задачы. Мы іх фармулявалі разам у свой час, пачынаючы ад мясцовых дарог і заканчваючы будаўніцтвам новых дарог», — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт канстатуе: Мінск злучылі з усімі абласнымі цэнтрамі, а ў рэгіёнах ёсць праблемы.

«А там, на месцах, нам трэба больш-менш у нармальным стане падтрымліваць дарожна-транспартную сетку. Прынамсі, да аграгарадкоў мы павінны даязджаць свабодна на аўтамабілі», — заўважыў кіраўнік краіны.

Таксама ён пацікавіўся рэалізацыяй іншых буйных будаўнічых праектаў у транспартным сектары і альтэрнатыўнымі шляхамі паставак нашай прадукцыі.

**Марыя ДАДАЛКА.**

## Каментарый у тэму

**Аляксей АЎРАМЕНКА, міністр транспарту і камунікацый Беларусі, паведаміў, што дынаміка паказчыкаў галіны стабільная. Па першым паўгоддзі экспарт паслуг дадаў 19 % да леташняга ўзроўню. Прэзідэнт заўважыў: калі вытрымаем гэты тэмп да канца года, будзе вельмі добра. За паўгоддзе на экспарце зарабілі больш за два мільярды долараў, у канцы года трэба арыентавацца на чатыры мільярды.**

Як расказаў пасля нарады журналістам міністр, на сустрэчы таксама абмяркоўваліся праблемныя пытанні работы службаў таксі. Прэзідэнт адобрыў падыходы Міністэрства транспарту і камунікацый да змен у галіне аўтамабільных перавозак пасажыраў. Ведамства раней падрыхтавала адпаведны праект указа. У прыватнасці, дакументам мяркуецца ўвесці рэгістрацыйныя карты транспартнага сродку, карты допуску кіроўцы, дыспетчара аўтамабільных перавозак пасажыраў у нерэгулярных зносінах і дыспетчара таксі. Гэта дасць магчымасць упарадкаваць работу ў гэтым сектары.

Мы фактычна ідзём па шляху Расійскай Федэрацыі. Яны выкарыстоўваюць прыкладна аналагічныя падыходы да работы таксі. Сёння рынак да канца не ўрэгуляваны з пункту гледжання наяўнасці транспартных сродкаў, кампаній, якія працуюць. Маецца на ўвазе ўсё гэта рабіць у электронным выглядзе. Гэта значыць, будзе электронная база з кіроўцамі, транспартнымі сродкамі», — адзначыў міністр.

У першую чаргу гэта робіцца, каб гарантаваць бяспеку перавозак, падкрэсліў Аляксей Аўраменка. «Гэта неліцэнзаваны від дзейнасці. Калі кіроўца хоча працаваць, у яго павінна быць заведзеная картка ўліку, дзе будуць фіксавацца ўсе парушэнні, праходжанне тэхнічнага агляду транспартнага сродку, адпаведнасць транспартнага сродку заяўленым паслугам. Тым самым не будзем дапускаць да перавозак нявопытных кіроўцаў», — дадаў ён.

З кіраўніком краіны таксама ўзгоднена перараспрацоўванне сродкаў інвестыцыйных праектаў. Над аднаўленнем дарогі Р46 працаваць будуць з кітайскімі партнёрамі, а работу па дарозе М3 мяркуюць весці з Еўразійскім банкам развіцця. Увогуле, па словах міністра, кіраўнік краіны паставіў задачу рэканструяваць не менш за 1000 кіламетраў мясцовых дарог.

Гэтым часам працягваецца рэканструкцыя трас Мінск — Смалявічы, Р23 у кірунку Слуцк — Салігорск, Р16 у Брэсцкай вобласці на граніцы з Польшчай.

Як дадаў Аляксей Аўраменка, Беларусь гатова аператыўна рэагаваць на абмежаванні перавозак калійных угнаенняў.

«У нас у лютым было падпісана пагадненне з Расійскай Федэрацыяй. Мы фактычна з лютага на расійскія парты перавезлі парадку аднаго мільёна тон нафтапрадуктаў. Адпаведна, у нас ёсць альтэрнатывы. Гэта парты Ленінградскай вобласці, Мурманска. Схемы напрацаваны. Таму будзем вельмі аператыўна рэагаваць на змены альбо ўвядзенне нейкіх дадатковых абмежаванняў у частцы перавозкі калійных угнаенняў», — сказаў Аляксей Аўраменка.

Кожны трэці

# ІХ ВЫХАВАЛА РАДЗІМА...

**Акупанты, якія ў 1943 годзе бязлітасна расправіліся з партызанскай сувязной і дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР Вольгай Ярковіч, пакінулі сіротамі пяцярых дзяцей**

**Сёлета 22 чэрвеня беларускія парламентарыі прэзентавалі кнігу «Яны былі першымі» — аб дэпутатах Вярхоўнага Савета БССР першага склікання, якія загінулі ці зніклі без вестак у гады Вялікай Айчыннай вайны. А ўжо праз некалькі тыдняў знайшліся сваякі адной з гераінь выдання. Днямі дзеці, унукі, а таксама праўнукі Вольгі Ярковіч, імя якой навечна нанесена на мемарыяльнай дошцы ў фае Авальнай залы Дома ўрада, сабраліся ў гэтым легендарным будынку, дзе да вайны працавала іх сваячка.**



Вольга Ярковіч (у другім радзе другая злева).

## Замест казак — аповеды пра вайну

Дэпутаты — члены рабочай групы Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па справах беларусаў замежжа адгукнуліся на просьбу нашых суайчыннікаў, якія пражываюць у розных рэгіёнах Расіі, а таксама ў іншых краінах СНД, і запрасілі іх на сустрэчу. Кніга, якую яны не так даўно прэзентавалі, у тым ліку і была разлічана на тое, каб у гісторыі беларускага парламента як мага менш заставалася прабелаў, а біяграфіі дэпутатаў, якія ўжо даўно сталі легендамі, папаўняліся новымі звесткамі.

— Вялікія гістарычныя падзеі папярэднічалі нашай сустрэчы са сваякамі дэпутата Вольгі Ярковіч, — адзначыла **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Валянціна РАЖАНЕЦ.** — Кантакты з нашымі суайчыннікамі за мяжой нас вельмі радуюць: мы маем магчымасць супрацоўнічаць у культурным, эканамічным, сацыяльным планах, і народная дыпламатыя вельмі многае азначае ва ўсталяванні нашых адносін. Гэта наша агульная гісторыя, агульная памяць, гэта імёны тых людзей, якія, не шкадуючы свайго жыцця, адстаялі мір і спакой на нашай зямлі. Дзякуючы ім мы сёння можам весці стваральную работу. Гэтая памяць павінна перадавацца з пакалення ў пакаленне. І вельмі прыемна, што нашы госці прыехалі са сваімі нашчадкамі, якія з'яўляюцца школьнікамі: яны наведаюць гістарычныя мясціны, пабываюць на радзіме сваіх продкаў.

Як прызналася ўнучка дэпутата Вярхоўнага Савета БССР першага склікання, для яе Беларусь — другая Радзіма. «Любоў да вашай краіны нам перадалася з малаком маці, — заўважыла Валянціна Фірсава, якая прыехала з Масквы. — Да 9 класа кожнае лета я была ў Беларусі, дзе мы заўжды наведвалі памятныя мясціны. І вось у чарговы раз я вярнулася дадому. Усе сваякі з боку мамы жывуць тут. У нас вельмі дружная сям'я, якая шануе памяць аб сваіх продках. Я вырасла без бабулі. І казак, якія тыя звычайна расказваюць сваім унукам, мы ніколі не чулі. Замест іх, будучы дзецьмі, мы чулі сумныя аповеды пра вайну і тыя падзеі, якія закранулі маю маму, яе родных і блізкіх».

## Дзеці засталіся сіротамі

Вольга Авілаўна Ярковіч у Вярхоўны Савет БССР была абрана ад Паўлаўскай выбарчай акругі Круглянскага раёна Магілёўскай вобласці 26 чэрвеня 1938 года. Дарэчы, першы парламент існаваў да 1947 года: у самую цяжкую хвіліну — перад вайной і ў складаныя пасляваенныя гады, калі трэба было аднаўляць краіну. Такі давер звычайная жыхарка вёскі Храпы, што ў Круглянскім раёне на Магілёўшчыне, якая спачатку працавала цялятніцай, а потым узначальвала калгас «1 Мая», заслужыла сваімі клапатлівымі і справядлівымі адносінамі да людзей, уласнай працавітасцю і адданасцю справе. А, між іншым, лёс Вольгу Ярковіч не песціў: у 1932 годзе яе мужа забілі. Жанчына засталася адна з пяццю дзецьмі.

Калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, Вольга Ярковіч атрымала распараджэнне не выязджаць з Беларусі. Трэба было заставацца на месцы, каб арганізоўваць партызанскі рух. Так звычайная сялянская жанчына, якая ўжо папрацавала на дзяржаўнай службе, стала сувязной партызанскага атрада імя Героя Савецкага Саюза Жуніна. Разам з ёй уступіў у атрад і сын Ваня.

Іван Ярковіч адзін з першых даведаўся, як гітлераўцы расправіліся з яго маці. Вольгу Авілаўну тройчы арыштоўвалі немцы, столькі ж ёй удавалася ўцячы. У чацвёрты раз не атрымалася...

— Бабулю выдалі паліцаі, свае людзі — аднавяскоўцы, — удакладніў унук Вольгі Ярковіч. — Больш за тое, яны разам з акупантамі яшчэ яе і катавалі. Нават пагражалі дзецям, што іх забяруць і вывезуць у Германію. Планавалі вывезці туды і бабулю, каб публічна пакараць. Аднак загінула Вольга Авілаўна на сваёй зямлі: у адной з хат у вёсцы Цяцерына жанчыну закатавалі і зажыва спалілі. Сёння прозвішчы здраднікаў нам вядомыя.

Ішоў 1943 год... Вайна яшчэ не скончылася, а пяцёра яе дзяцей ужо засталіся круглымі сіротамі. Па словах унучкі, разам з Вольгай Ярковіч у гестапа сядзела яшчэ адна жанчына з іх вёскі, якую звалі Домна. «Бабуля прасіла, каб тая прыйшла ў Храпы і сказала, што дахаты яна ўжо больш не вернецца, — расказала Валянціна Фірсава. — Абвяла яе вачамі знізу ўверх і сказала: «Маіх дзяцей падыме дзяржава». Так яно і атрымалася — маю маму сапраўды выхавала Радзіма».

У гонар маці-патрыёткі назвалі адну з праўнучак дэпутата Вярхоўнага Савета БССР. «З самага дзяцінства я ведала, што нашу імя прабабулі, толькі раней не надавала гэтаму асаблівага значэння, — прызналася Вольга Міронычык. — Сёння ж вельмі ганаруся сваёй прабабуляй: з гадамі ўсведамляеш, які подзвіг яна здзейсніла».

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота аўтара.**



Сваякі дэпутата Вярхоўнага Савета БССР першага склікання Вольгі Ярковіч разам з парламентарыямі падчас сустрэчы.

Дзмітрый ПІНЕВІЧ:

# «ЗДАРОЎЮ ДЗЯЦЕЙ НІЧОГА НЕ ПАГРАЖАЕ»

**Сітуацыя ў аздараўленчым цэнтры «Лясная паляна» пад Смаргонню цалкам знаходзіцца пад кантролем, заявіў учора міністр аховы здароўя Дзмітрый ПІНЕВІЧ, перадае карэспандэнт БелТА.**

«Сітуацыя пад кантролем. Яна была перададзена кіраўніку дзяржавы яшчэ на мінулым тыдні і ўзятая цалкам пад яго асабісты кантроль. Самае асноўнае — здароўю дзяцей цяпер нічога не пагражае. Але для нас гэты аспект важны з пункту гледжання вывучэння сітуацыі», — сказаў Дзмітрый Піневіч.

Паводле яго слоў, цяпер усе дзеці разбітыя на дзве групы. «Першая група — дзеці, якія маюць мінімальныя сімптомы захворвання, яны размешчаны ў Астравецкай ЦРБ. Другая група — дзеткі з пацверджаным каранавірусам, але без сімптомаў. Яны знаходзяцца ў цэнтры пад медназіглядам асобна ад іншых», — адзначыў міністр.

Астатняя група дзяцей (кантакты першага ўзроўню) таксама знаходзяцца пад пільным наглядам медыцынскіх работнікаў.

«З клінічнга пункту гледжання нам важныя дбайнае назіранне і аналіз кантагіёзнасці вірусу ў дзяцей (гэта вірус «дэльта»), яго цячэнне і прагноз (наколькі хутка знікаюць праявы). Мы знаходзімся на парозе навучальнага года і павінны ацаніць выпрацаваныя (сумесна з зацікаўленымі) крокі па прадухіленні хуткага распаўсюджвання COVID-19. Мы правялі маніторынг усіх аздараўленчых летнікаў — як сезонных, так і круглагадовых. Усюды сітуацыя спакойная: у адным з лагераў у Чавускім раёне мы выявілі спарадычныя выпадкі, якія не запатрабавалі асаблівых мерапрыемстваў», — сказаў у завяршэнне Дзмітрый Піневіч.

## Ашуканскі крэдыт праз аддалены доступ

**У міліцыю Ленінскага РУУС сталіцы звярнуўся 31-гадовы мінчанін, які паведаміў, што невядомыя аформілі на яго крэдыт на суму 5000 рублёў.**

Як высветлілася, на месенджар пацярпелага паступіў званок ад невядомага, які паведаміў, што з яго банкаўскай аплатнай карты ажыццяўляюцца несанкцыянаваныя аплатныя аперацыі. У ходзе далейшай размовы лжэсупрацоўнік папрасіў мужчыну ўстанавіць на мабільны тэлефон дадатак аддаленага доступу. Праз нейкі час пацярпеламу патэлефанавалі са схаванага нумара і прадставіліся супрацоўнікам міліцыі. Той, хто звяртаўся, папрасіў не рэагаваць на паведамленні з кодамі, што прыходзяць, але ў асабістым кабінеце банка правяраць, ці не спісаліся грошы з карты. Тым самым праз устаноўленне праграмы аддаленага доступу ашуканцы атрымалі асабістыя даныя ўладальніка карт-рахунку, а пасля аформілі на яго крэдыт і перавялі грошы на карту іншай асобы, паведамляе падрабязнасці ГУУС Мінгарвыканкама.

Зараз праваахоўнікі праводзяць мерапрыемствы па ўстанаўленні асоб, датычных да гэтага злачынства.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Будзь у курсе!

## ЯКІ ПОПЫТ — ТАКІ І ПАМЕР РУХУ

### На некаторых участках цягнікі здымаюцца з абарачэння

**У сувязі з прывядзеннем памераў руху цягнікоў рэгіянальных ліній эканом-класа ў адпаведнасць з фактычным попытам на перавозку Беларуская чыгунка змяняе маршруты курсіравання, перыядычнасць, расклад некаторых цягнікоў, паведамляе прэс-цэнтр магістралі.**

А таксама адмяняе шэраг цягнікоў з абарачэння на наступных участках: Слуцк — Салігорск (з 16 жніўня), Гомель — Добруш (з 19 жніўня), Гомель — Краўцоўка (з 20 жніўня), Калінкавічы — Славечна (з 21 жніўня), Мінск — Баранавічы, Гродна — Ліда, Лунінец — Бухлічы, Лунінец — Жыткавічы, Гомель — Васілевічы (з 23 жніўня), Мінск — Барысаў, Мінск — Маладзечна — Гудагай, Маладзечна — Глыбокае, Мінск — Асіповічы (з 30 жніўня).

Беларуская чыгунка просіць пасажыраў з разуменнем паставіцца да сітуацыі, якая склалася, і своечасова планаваць свае паездкі з улікам змененага графіка руху цягнікоў рэгіянальных ліній эканом-класа.

Больш падрабязную інфармацыю аб раскладзе руху цягнікоў можна даведацца на афіцыйным сайце Беларускай чыгункі www.rw.by і па тэлефоне кантакт-цэнтра БЧ 105.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Надвор'е

## ФРОНТ АДЫХОДЗІЦЬ, ФРОНТ НАДЫХОДЗІЦЬ,

### або Ад кароткачасовых дажджоў да навальніц

**17 жніўня ўмовы надвор'я ў Беларусі будуць вызначаць атмасферныя франты і цёплая няўстойлівая паветраная маса. Воблачна з праясненнямі. На большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, у асобных раёнах моцныя дажджы. Месцамі прагрымяць навальніцы.**



Вецер паўднёва-заходні, заходні ўмераны, пры навальніцах месцамі моцны парывісты. Тэмпература паветра ноччу плюс 14—20, днём ад 20 па захадзе да 34 градусаў ва ўсходніх раёнах краіны, па Магілёўскай і Гомельскай абласцях месцамі паветра прагрэецца да плюс 35. Атмасферны ціск уначы будзе падаць, днём расці. Воблачна з праясненнямі.

18 жніўня надвор'е будзе вызначаць атмасферны фронт, што павольна адыходзіць на тэрыторыю Расіі, услед за якім пачне паступаць умерана цёплая паветраная маса з Заходняй Еўропы. Месцамі па краіне чакаюцца кароткачасовыя дажджы, навальніцы. Вецер заходняй чвэрці ўмераны, у асобных раёнах парывісты. Тэмпература паветра ўначы плюс 9—16, днём 18—24 вышэй за нуль.

19 жніўня Беларусь застанецца ва ўмерана цёплай паветранай масе, у дзённыя гадзіны па паўночным захадзе адаб'ецца ўплыў атмасфернага фронту, які ссоўваецца з Балтыкі. Пераважна без ападкаў, толькі днём месцамі па паўночным захадзе краіны кароткачасовыя дажджы, магчымыя навальніцы. Ноччу і раніцай па паўднёвым усходзе слабы туман. Вецер паўднёва-заходні ўмераны, днём у асобных раёнах парывісты. Тэмпература паветра ўначы 8—14 цяпла, днём ад 18 па паўночным захадзе да 26 па паўднёвым усходзе краіны.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Каб помнілі...

## ПРАЙШЛІ ТОЙ ЖА ДАРОГАЙ...

### У горадзе Ганцавічы адбылася акцыя «У памяці няма тэрміну даўнасці»

**Мерапрыемства было прымеркавана да 80-й гадавіны масавага расстрэлу мірных жыхароў на 7-м кіламетры дарогі Ганцавічы — Хатынічы.**



Фота БелТА.

У гэты дзень у 1941 годзе фашысты сагналі больш за 300 жыхароў Ганцавічаў, вывелі іх за ўскраіну мястэчка і расстралялі ў лясным масіве.

«Гэта быў першы масавы расстрэл мірных жыхароў у Ганцавіцкім раёне. Дакладная колькасць загінулых дагэтуль невядомая. Сярод іх былі цэлыя сем'і — дзеці, жанчыны, старыя, — адзначыла **дырэктар раённага краязнаўчага музея Наталля КУЛЕШ**. — Усяго ж за гады Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі раёна загінулі 8725 чалавек».

Дзень памяці пачаўся з богаслужэння ў Свята-Ціханаўскай царкве ў горадзе Ганцавічы. Потым ганцавічане прайшлі хрэсным ходам частку дарогі, па якой роўна 80 гадоў таму карнікі вялі мясцовых жыхароў на расстрэл. Тут, дзе ў 2005 годзе быў устаноўлены новы помнік, і адбыўся мітынг-рэквіем. У ім узялі ўдзел прадстаўнікі кіраўніцтва раёна, працоўных калектываў, духавенства, навучэнцы Хатыніцкай сярэдняй школы — усяго каля 100 чалавек.

«Самае галоўнае ў жыцці — мір на зямлі. Напэўна, міралюбнасць і талерантнасць — аснова менталітэту беларусаў. Таму наша задача — цяперашняга і будучых пакаленняў — памятаць аб тым, што адбылося тут 80 гадоў таму, каб ніколі не дапусціць паўтарэння», — адзначыў **старшыня Ганцавіцкага райвыканкама Уладзімір БЯЛОЎ.**

Удзельнікі акцыі ўшанавалі памяць суайчыннікаў хвілінай маўчання, усклалі вянкі і кветкі да месца гібелі.

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Авіякампаніі пачалі пазбягаць паветранай прасторы Афганістана

**Як паведамляе агенцтва Reuters, упраўленне грамадзянскай авіяцыі Афганістана заявіла, што паветраная прастора Кабула знаходзіцца пад кантролем вайскоўцаў, і параіла транзітным самалётам змяніць маршрут.**





Авіякампаніі United Airlines, British Airways і Virgin Atlantic ужо перасталі выкарыстоўваць паветраную прастору Афганістана, пасля таго як талібы ўзялі пад свой кантроль прэзідэнцкі палац у Кабуле. Усе камерцыйныя палёты з міжнароднага аэрапорта Кабула імя Хаміда Карзая і ў яго прыпынены.

Па даных газеты Daily Sabah, нацыянальны авіяперавозчык Турцыі Turkish Airlines адмяніў усе свае рэгулярныя рэйсы ў Афганістан. У сталіцу Кабул будуць накіроўвацца толькі самалёты для эвакуацыі грамадзян Турцыі.

Многія еўрапейскія авіякампаніі, якія ажыццяўлялі планавыя рэйсы ў Афганістан, таксама адмянілі іх з-за напружанасці ў краіне і адсутнасці гарантаванай дыспетчарскай падтрымкі палётаў.

У той жа час, як заявіў кіраўнік мінабароны Вялікабрытаніі Бэн Уолес, захоп улады ў Афганістане баевікамі радыкальнага руху «Талібан» прывядзе да значнага наплыву мігрантаў у іншыя краіны. Пра гэта паведамляе ТАСС. «Я мяркую, што мы ўбачым значны паток мігрантаў па ўсім свеце», — сказаў ён, дадаўшы, што Турцыя, Пакістан і Індыя ўжо адзначылі наплыў афганскіх бежанцаў.

14 красавіка Джо Байдэн абвясціў пра сваё рашэнне завяршыць аперацыю ў Афганістане, якая стала самай працяглай замежнай ваеннай кампаніяй у амерыканскай гісторыі. Баевікі «Талібана» ўвайшлі ў нядзелю ў Кабул без бою і пачалі займаць пакінутыя ўрадавымі сіламі дзяржаўныя ўстановы. Прэзідэнт Афганістана Ашраф Гані пакінуў краіну.

### Занепакоенасць дзеяннямі Латвіі

**Прадстаўнік Упраўлення Вярхоўнага камісара ААН па справах бежанцаў (УВКБ ААН) у рэгіёне Паўночных краін і Балтыі Элізабет Хаслунд выказала занепакоенасць дзеяннямі Латвіі на граніцы, дзе супраць мігрантаў прымяняецца гвалт і людзей прымусова адпраўляюць назад. Пра гэта паведамляе Delfi.**

«Мы вельмі занепакоеныя паведамленнямі аб выцясненні назад праз граніцу і гвалце, якія ўжываюцца супраць асоб, што спрабуюць перасекчы граніцу, і заклікаем усе зацікаўленыя бакі паважаць асноўныя гуманітарныя прынцыпы, прытрымлівацца міжнароднага і еўрапейскага права і ўстрымлівацца ад гвалту», — заявіла Элізабет Хаслунд.

Яна асабліва падкрэсліла, што магчымасць шукаць прыстанішча — адно з галоўных правоў чалавека.

### Колькасць загінулых падчас землятрусу на Гаіці вырасла да 1297

**Колькасць ахвяр падчас землятрусу магнітудай 7,2 бала на Гаіці вырасла да 1297. Пра гэта паведамляе AFP News Agency ў сваім Twitter-акаўнце са спасылкай на ўлады.**



Раней Геалагічная служба ЗША (USGS) папярэдзіла, што колькасць загінулых з-за землятрусу на Гаіці можа дасягаць некалькіх тысяч чалавек, а пацярпелых — дзесяткаў тысяч.

14 жніўня каля берагоў Гаіці зафіксавалі землятрус магнітудай 7,2 бала. Адзначаецца, што эпіцэнтр падземных штуршкоў размяшчаўся за восем кіламетраў на поўнач ад населенага пункта Пеці-Тру-дэ-Ніп, а ачаг залягаў на глыбіні 10 кіламетраў.



**Аляксандр ВАЛЬФОВІЧ:**

# «ВУЧЭННЕ «ЗАХАД-2021» ПАЦВЯРДЖАЕ КУРС НАШАЙ КРАІНЫ НА ЎМАЦАВАННЕ РЭГІЯНАЛЬНАЙ БЯСПЕКІ І ПРЫХІЛЬНАСЦЬ ДА САЮЗНІЦКІХ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВАЎ З РАСІЯЙ»

**Сістэма абароны дзяржаўнай граніцы Беларусі ад замахаў звонку працуе добра і зладжана. Упэўненасць у гэтым выказаў дзяржаўны сакратар Савета бяспекі Аляксандр Вальфовіч у інтэрв'ю БЕЛТА. Ён закрануў тэматыку новых рызык і пагроз для нашай краіны, праблем з бежанцамі на граніцы Беларусі з ЕС і расказаў, чаму канцэнтраваць усе рэсурсы толькі на процідзеянні міграцыйным працэсам нерацыянальна. Дзяржсакратар таксама пракаменціраваў павышэнне ваеннай актыўнасці ЗША і НАТА ў Еўропе, у тым ліку каля нашых граніц, і падзяліўся падрабязнасцямі правядзення беларуска-расійскага вучэння «Захад-2021».**

***— Аляксандр Рыгоравіч, якія на сённяшні дзень вы бачыце новыя рызыкі і выклікі для Рэспублікі Беларусь?***

— Геапалітычныя змяненні ў рэгіёне, эканамічныя санкцыі, пандэмія каранавіруса і іншыя фактары садзейнічаюць фарміраванню новых рызык і выклікаў для нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь, а таксама трансфармацыі ўжо вядомых.

На жаль, мы бачым, што скарачаецца супрацоўніцтва ва ўсіх сферах міжнародных адносін. Абвастраюцца стаўшыя ўжо хранічнымі «тлеючыя» канфлікты, паскараецца эрозія сістэмы міжнароднага права, уключаючы бяспеку, гандаль і сектаральнае ўзаемадзеянне.

Безумоўна, новыя віткі пратэкцыянізму і нарошчванне намаганняў усіх геапалітычных ігракоў па павышэнні сваёй стратэгічнай аўтаноміі аказваюць уплыў на змест беларускай знешняй палітыкі.

Адзначу, што ў эканамічнай сферы ўзмацняюцца існуючыя і з'яўляюцца новыя абмежавальныя бар'еры ва ўзаемным гандлі, пагрозы перспектывам рэалізацыі сумесных праектаў з іншымі краінамі, прыпыненне транспартных патокаў, масавы адток у іншыя краіны беларускіх спецыялістаў высокай кваліфікацыі.

Акрамя таго, адзначаецца абвастрэнне праблем забеспячэння інфармацыйнай бяспекі. З выкарыстаннем сродкаў масавай інфармацыі і сацыяльных сетак мэтанакіравана абвастраецца абстаноўка. У такіх умовах задача процідзеяння масіраванаму інфармацыйнаму ўздзеянню на насельніцтва набывае дадатковую актуальнасць.

Сучасная сітуацыя таксама агаляе неабароненасць перад выкарыстаннем інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій для маніпулявання інфармацыяй, дамінавання або палітычнага процістаяння.

Хачу звярнуць увагу, што назіраецца павышэнне ваеннай актыўнасці вакол Беларусі. Павялічваецца колькасць войскаў у сумежных з Беларуссю дзяржавах, маштабнасць праводзімых мерапрыемстваў іх аператыўнай і баявой падрыхтоўкі. Разгортваецца гонка ўзбраенняў і павышаецца разведвальная актыўнасць нашых заходніх «партнёраў». Прадаўжаецца дэградацыя механізмаў кантролю над узбраеннямі.

У сувязі з гэтым адзначаецца з'яўленне недаверу паміж дзяржавамі, адмова ад транспарэнтнасці ў ваеннай дзейнасці і ўзнікненне «гібрыдных дзеянняў».

***— Як вы ацэньваеце сітуацыю на граніцы нашай краіны з Еўрасаюзам?***

— Сёння на граніцы адзначаецца значнае павелічэнне патоку нелегальных мігрантаў, асабліва на заходнім напрамку. Гэта звязана як з сезоннасцю міграцыйных працэсаў, так і з сацыяльна-палітычнай сітуацыяй у тых краінах, з якіх людзі імкнуцца сёння выехаць. Яны хочуць засцерагчы сябе і свае сем'і ад ваенных дзеянняў, палітычных і эканамічных крызісаў і накіроўваюцца ў краіны з больш стабільнай, на іх думку, абстаноўкай.

Нараўне з гэтым не трэба забываць пра такія пагрозы, як распаўсюджванне наркотыкаў, кантрабанда зброі, боепрыпасаў, радыеактыўных матэрыялаў. Ад умення процістаяць ім у многім залежыць бяспека дзяржавы, кожнага грамадзяніна Беларусі. І канцэнтраваць усе рэсурсы толькі на процідзеянні міграцыйным працэсам нерацыянальна. Тым больш што мігранты не выбіраюць нашу краіну ў якасці канчатковага прыпыначнага пункта.

Адзначу, што ў цэлым сітуацыя на нашых рубяжах застаецца напружанай, але кантралюемай. Пры гэтым для забеспячэння памежнай бяспекі задзейнічана не толькі памежнае ведамства. Да аховы граніцы актыўна прыцягваюцца і іншыя сілавыя структуры, якія таксама з'яўляюцца суб'ектамі забеспячэння памежнай бяспекі.

Напрыклад, нядаўна на ўчастку Гродзенскай памежнай групы праходзіла аператыўна-тактычнае вучэнне, у час якога ваеннаслужачыя памежнай групы і механізаванай брыгады выконвалі службова-баявыя задачы па ліквідацыі ўмоўнага праціўніка ў блакіраваным раёне.

Адзначу высокі ўзровень падрыхтоўкі і эфектыўнасць узаемадзеяння органаў памежнай службы і падраздзяленняў Узброеных Сіл. Асаблівасцю гэтага вучэння было і тое, што ўдзел у ім прынялі таксама часова прызваныя з запасу грамадзяне, якія раней служылі ў пагранвойсках.

Гэта яшчэ раз пацвярджае здольнасць і гатоўнасць органаў забеспячэння нацыянальнай бяспекі паспяхова выканаць усклазеныя на іх задачы па абароне суверэнітэту Рэспублікі Беларусь. Сістэма абароны дзяржаўнай граніцы ад замахаў звонку працуе добра і зладжана.

***— ЗША і НАТА ўжо больш за сем гадоў пад выглядам стратэгічнага стрымлівання Расіі актыўна нарошчваюць ваенную прысутнасць у шэрагу еўрапейскіх дзяржаў, у тым ліку сумежных з Беларуссю. Ці можна сцвярджаць, што сумесныя беларуска-расійскія вучэнні «Захад-2021» — своеасаблівы адказ на гэта нарошчванне?***

— Узброеныя Сілы Рэспублікі Беларусь праводзяць сумесныя беларуска-расійскія вучэнні на сваёй тэрыторыі для павышэння ўзроўню падрыхтоўкі і зладжанасці войскаў са складу рэгіянальнай групоўкі, прызначанай для забеспячэння бяспекі ва Усходне-Еўрапейскім рэгіёне.

Перыядычнасць іх правядзення вызначана ў 2009 годзе прэзідэнтамі Беларусі і Расіі: адзін раз у два гады па чарзе. На нашай тэрыторыі было праведзена вучэнне «Захад» у 2009, 2013 і 2017 гадах, а на тэрыторыі Расіі — «Шчыт Саюза» ў 2011, 2015 і 2019 гадах.

Вучэнне «Захад-2021», як і папярэднія, з'яўляецца вышэйшай формай падрыхтоўкі войскаў і мае абарончы характар. Дзеянні органаў ваеннага кіравання, злучэнняў і воінскіх часцей са складу рэгіянальнай групоўкі войскаў (сіл) у ходзе вучэння накіраваны на ўдасканаленне форм і спосабаў прымянення войскаў, выпрацаваных ва ўзброеных сілах дзвюх дзяржаў з улікам вопыту ўзброеных канфліктаў апошніх гадоў.

Разам з тым нас не можа не хваляваць павышэнне ваеннай актыўнасці ЗША і НАТА ў Еўропе, у тым ліку каля нашых граніц, асабліва правядзенне такіх маштабных вучэнняў, як «Абаронца Еўропы». У сувязі з гэтым мы актывізавалі рэалізацыю мер стратэгічнага стрымлівання ў ваеннай сферы як самастойна, так і ў рамках Саюзнай дзяржавы. У тым ліку гэта вучэнне будзе выкарыстана ў інтарэсах процідзеяння выклікам і пагрозам нашай дзяржаве.

Упэўнены, што правядзенне сумеснага вучэння на адзіным стратэгічным фоне ўмацуе адзінства поглядаў абаронных ведамстваў Беларусі і Расіі на забеспячэнне ваеннай бяспекі Саюзнай дзяржавы, адпрацоўку на практыцы падыходаў, прадугледжаных планам прымянення рэгіянальнай групоўкі войскаў (сіл).

***— Па складзе і колькасці прыцягнутых войскаў, якія нядаўна на брыфінгу агучыў начальнік Генеральнага штаба Узброеных Сіл, вучэнне падобна да «Захаду-2017». Чым абумоўлены фармат і маштабы гэтага вучэння?***

— Задума вучэнняў такога маштабу, як «Захад», вызначаюць генеральныя штабы ўзброеных сіл Беларусі і Расіі. У яго аснову пакладзены сцэнарый узнікнення на тэрыторыі ўмоўнай дзяржавы канфлікту, звязанага з узрастаннем актыўнасці дзейнасці незаконных узброеных фарміраванняў, сепаратысцкіх і міжнародных тэрарыстычных арганізацый, фінансуемых з-за мяжы.

Па сутнасці, такая актыўнасць — адна з асноўных характэрных рыс сучасных ваенных канфліктаў. Пры гэтым выкарыстаны адзін з магчымых варыянтаў развіцця ваенна-палітычнай абстаноўкі, які прадугледжвае абвастрэнне міжнародных супярэчнасцей да ўзроўню, здольнага прывесці да дэстабілізацыі абстаноўкі ў рэгіёне, а таксама развязвання агрэсіі супраць Саюзнай дзяржавы.

На аснове задумы вызначана, якія задачы неабходна вырашыць у ходзе вучэння, які склад сіл і сродкаў прыцягнуць для гэтага. Паколькі ў склад рэгіянальнай групоўкі войскаў уваходзяць злучэнні і воінскія часці 1-й танкавай арміі Заходняй ваеннай акругі Узброеных Сіл Расійскай Федэрацыі, то яны і складаюць аснову расійскага воінскага кантынгенту, які ўдзельнічае ў вучэнні на нашай тэрыторыі.

Адзначу, што правядзенне вучэння «Захад-2021» пацвярджае курс Рэспублікі Беларусь на ўмацаванне рэгіянальнай бяспекі і прыхільнасць да саюзніцкіх абавязацельстваў з Расійскай Федэрацыяй. Менавіта таму ў перыяд правядзення вучэння на тэрыторыі Расіі будзе адначасова дзейнічаць кантынгент беларускіх Узброеных Сіл. Так, ад Узброеных Сіл Беларусі на палігоне Муліна ў вучэнні прыму́ць удзел каля 400 ваеннаслужачых і больш за 30 адзінак баявой тэхнікі.

На «Захад-2017» было прыцягнута каля 12,7 тысячы чалавек, у тым ліку амаль 3 тысячы расійскіх ваеннаслужачых, да 370 адзінак бранятанкавай тэхнікі, у тым ліку каля 140 танкаў, да 150 адзінак артылерыі і РСЗА, больш за 40 самалётаў і верталётаў.

***— У СМІ можна сустрэць негатыўныя выказванні замежных ваенных экспертаў наконт правядзення буйнамаштабных вучэнняў на беларускай зямлі. Як, на вашу думку, трэба ставіцца да такой ацэнкі?***

— Лічу, што не трэба перабольшваць увагу да такіх выказванняў. Як правіла, яны ўзнікаюць напярэдадні такіх вучэнняў. Усломніце хоць бы істэрыю ў сувязі з «Захадам-2017». Чаго толькі не пісалі так званыя незалежныя СМІ. Напрыклад, аб тым, што нібыта Расія і Беларусь маюць намер акупіраваць частку Польшчы і Літвы ў раёне Сувалкскага калідора, што расійскія войскі нібыта ўвойдуць на тэрыторыю Беларусі і тут застануцца, будуць ледзь не схаваны ў беларускіх лясах, што Уладзімір Пуцін пад выглядам вучэння нібыта хоча размясціць на пастаяннай аснове сваю авіябазу і да таго падобнае. І што ў выніку? Як толькі вучэнне завяршылася, адразу ж заціхла і інфармацыйная шуміха вакол яго. Думаю, што так будзе і чарговы раз.

Нагадаю, што вучэнне «Захад-2021» праводзіцца ў адпаведнасці з планам сумесных мерапрыемстваў па забеспячэнні функцыянавання рэгіянальнай групоўкі войскаў (сіл) у бягучым годзе. Задуму яго правядзення кіраўнік дзяржавы зацвердзіў яшчэ ў пачатку года.

***— На нашай тэрыторыі вучэнні «Захад» праходзяць не першы раз. У чым асаблівасць цяперашняга?***

— У ходзе ўсіх праводзімых вучэнняў, як правіла, вырашаецца задача асваення новых спосабаў вядзення абарончых дзеянняў. Як вы ведаеце, у свеце пастаянна ўзнікаюць узброеныя канфлікты, таму задача ваенных іх аналізаваць і самае перадавое ўкараняць у практыку падрыхтоўкі сваіх войскаў. У гэтым плане не будзе выключэннем і цяперашняе вучэнне.

Асаблівасць праводзімага на нашай тэрыторыі вучэння «Захад» — практычная адпрацоўка такіх вучэбна-баявых задач, як стварэнне групоўкі войскаў у сціслыя тэрміны, перш за ўсё на аснове боеготовых воінскіх фарміраванняў, якія валодаюць высокім узроўнем мабільнасці і здольнасці да вядзення аўтаномных дзеянняў. Гэта значыць падраздзяленняў, якія не патрабуюць вялікіх тэрмінаў для іх прывядзення ў поўную баявую гатоўнасць і прызыву з запасу ваеннаабавязаных. Пры гэтым адмабілізаванне будзе праведзена ў тэрытарыяльных войсках.

Акрамя таго, на вучэнні будуць адпрацоўвацца асобныя прыёмы кіравання авіяцыяй ударных і сродкамі ППА ў час адбіцця ўдараў сродкаў паветранага нападзення ўмоўнага праціўніка і апрабаваны новыя спосабы вядзення абарончых дзеянняў, зыходзячы з вопыту ўзброеных канфліктаў.

***— Аляксандр Рыгоравіч, у бягучым годзе роля Савета бяспекі ў абароне суверэнітэту Беларусі ўзмоцнена. Якія рэальныя меры прыняты ўжо для гэтага?***

— Савет бяспекі Рэспублікі Беларусь выконвае важнейшую ролю ў жыццядзейнасці грамадства і дзяржавы, і ў сучасных умовах яна будзе толькі павышацца. Менавіта на гэта накіраваны нядаўна прыняты дэкрэт Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Аб абароне суверэнітэту і канстытуцыйнага ладу».

У адпаведнасці з гэтым дакументам у выпадку ўзнікнення асаблівых абставін — гібелі кіраўніка дзяржавы ў выніку замаху на яго жыццё, учынення акта тэрарызму, знешняй агрэсіі, у выніку іншых дзеянняў насільнага характару — Савет бяспекі надзяляецца дадатковымі функцыямі. У такім выпадку на падставе яго рашэння ў краіне неадкладна ўводзіцца надзвычайнае або ваеннае становішча, а ўсе дзяржаўныя органы і службовыя асобы дзейнічаюць у адпаведнасці з рашэннямі Савета бяспекі. Нормы названага дэкрэта імплементаваны ў законы «Аб надзвычайным становішчы» і «Аб ваенным становішчы». Унесены таксама змяненні ў закон «Аб Узброеных Сілах Рэспублікі Беларусь».

Акрамя таго, указам зацверджана новае палажэнне аб Савеце бяспекі Рэспублікі Беларусь. Гэты дакумент не толькі абнаўляе і актуалізуе нормы, якія рэгламентуюць дзейнасць Савета бяспекі, але і накіраваны на павышэнне яго ролі ў абароне незалежнасці, тэрытарыяльнай цэласнасці, суверэнітэту і канстытуцыйнага ладу Рэспублікі Беларусь, падтрыманні грамадзянскага міру і згоды ў краіне, процідзеянні экстрэмізму і барацьбе з тэрарызмам.

Пры яго падрыхтоўцы ўлічваліся палажэнні і тэрміналогія канцэпцыі нацыянальнай бяспекі, ваеннай дактрыны, законаў Рэспублікі Беларусь у сферы забеспячэння бяспекі, накопленая практыка работы Савета бяспекі, а таксама замежны вопыт, у першую чаргу дзяржаў — членаў АДКБ.

У параўнанні з папярэднім палажэннем, якое было зацверджана ў 2000 годзе, больш дакладна вызначана асноўнае прызначэнне Савета бяспекі — рэалізацыя паўнамоцтваў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь як кіраўніка дзяржавы і галоўнакамандуючага Узброенымі Сіламі ў сферы забеспячэння нацыянальнай бяспекі. Адпаведна ў поўным аб'ёме замацаваны нормы дэкрэта «Аб абароне суверэнітэту і канстытуцыйнага ладу». У лік пастаянных членаў Савета бяспекі дадаткова ўключаны старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю і генеральны пракурор.

Адначасова з новым палажэннем аб Савеце бяспекі зацверджана новае палажэнне аб Дзяржаўным сакратарыяце Савета бяспекі, паколькі гэтыя дакументы непарыўна звязаны паміж сабой. Усе задачы і функцыі Дзяржаўнага сакратарыята Савета бяспекі, а таксама паўнамоцтвы дзяржаўнага сакратара прыншыпова захаваны ў цяперашнім аб'ёме. Галоўная іх сутнасць — інфармацыйна-аналітычнае, прававое і арганізацыйна-тэхнічнае забеспячэнне дзейнасці Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Савета бяспекі ў сферы нацыянальнай бяспекі.

# ГОСЦІ З ЛЕСУ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Мядзведзі і іншыя буйныя драпежнікі ўсё часцей выходзяць да людзей. Але паляваць на іх у краіне нельга, паколькі той жа мядзведзь знаходзіцца ў Чырвонай кнізе, і за яго раненне ці забойства давядзецца заплаціць велізарныя штрафы, а то і адправіцца ў калонію. Жывёліне нічога не растлумачыш. Але што рабіць людзям?!

Месяца паўтара таму буры мішка некалькі дзён запар літаральна тэрарызаваў адразу тры вёскі пад Барысавам. З'яўляўся ноччу. Людзей і жывёл не закрануў — прайшоўся па агародах, садах у пошуках вулляў і мёду. І дзесьці нават знайшоў пажыву.

Вядома, вяскоўцы перапалохаліся, сталі церабіць мясцовыя ўлады: маўляў, мядзведзя трэба адсачыць, усыпіць і перавезці далей у лес. Інакш не пазбегнуць бяды.

Упершыню касалапага заўважылі ў вёсцы Сыч Глівінскага сельсавета. Участак мясцовага пенсіянера Уладзіміра Галубоўскага — першы, які падвергнуўся нападу звера. Той раніцай мужчына, выйшаўшы на двор, заўважыў, што некаторыя вуллі распатрошаныя. Падумаў спачатку на мясцовых хуліганаў — маўляў, хто ж яшчэ такое мог натварыць. Але потым за некалькі метраў ад свайго ўчастка ўбачыў мядзведзя, які, наеўшыся, ад задавальнення качаўся па зямлі.

На яго падворку мядзведзь разбурыў тры пчоласям'і — з'еў мёд, пяргу і расплод. На выпадак наступнага прыходу кашлатага мужчына падрыхтаваўся.

Выклікаў міліцыянераў, тыя, у сваю чаргу, — эколагаў. Паколькі ў чырванакніжніка страляць забаронена, вырашылі перавезці яго ў запаведнік. Але як? Да звера трэба неяк падкрасціся, усыпіць. Потым ужо вырашаць пытанне з транспарціроўкай. А тым часам гаспадар лесу працягваў нашэсці на вясковыя падворкі.

Старшыня Глівінскага сельсавета Дзмітрый Ліпніцкі стварыў самы сапраўдны штаб па выратаванні вяскоўцаў ад рэйдаў звера. Ва ўсіх населеных пунктах у акрузе былі развешаны папярэджанні і нумары тэлефонаў экстранных службаў. Егеры і нарады міліцыі дзяжурылі літаральна кругласутачна і пры неабходнасці ў любы момант былі гатовы прыйсці на дапамогу.

«Людзі папярэджаныя, каб лес пакуль не наведвалі. Плануем вырабіць клетку, абсталяваць аўтамабіль і, калі ўдасца, перасяліць мядзведзя ў іншы квартал непадалёк ад лясніцтва Бярэзінскага запаведніка, каб не рабіў нікому шкоды», — адзначылі ў сельсавеце.

У Глускім раёне ўжо некалькі разоў бачылі бурага мядзведзя: мабыць, касалапы вырашыў пасяліцца тут надоўга. Аб тым, што бачыў у лесе буйнога драпежніка, першы паведаміў у інспекцыю старшыня раённай арганізацыі Беларускага таварыства паляўнічых і рыбаловаў Генадзь Корбут. Гэта быў канец мая. Тады вырашылі, што, хутчэй за ўсё, звер «транзітны», бо раней у гэтых мясцінах заўважаны не быў. Аднак у чэрвені Генадзь Корбут зноў бачыў мядзведзя, а праз некалькі тыдняў — ужо дваіх, аднаго каля вёскі Зубарэвічы, другога — на аўсяным полі ў раёне Падлужжа.

Мядзведзь — самы буйны драпежнік у нашай краіне, па сіле не мае сабе роўных сярод драпежных млекакормячых Беларусі. Ён аддае перавагу жыццю пустэльніка і пасяляецца толькі ў буйных густых лясных масівах, вельмі прыдзірліва выбірае месца для пражывання. Упадабаных мясцін прытрымліваецца, і толькі ў галодную пару вымушаны пакідаць іх у пошуках корму. Мядзведзі вельмі любяць чарніцы, у сезон могуць харчавацца выключна яе ягадамі, ахвочыя яны і да маліны, таму «ходзяць» у малінніку, пакуль не з'ядуць увесь ураджай. У канцы ліпеня і ў жніўні мядзведзі наведваюць пасевы аўса, каб паласавацца збожжам.

Спецыялісты папярэджваюць: цяпер і чалавеку трэба быць больш асцярожным. На той жа Глушычыне звер можа быць у лесе на ўсім працягу ад Зубарэвіч да Поўсткі, яго можна сустрэць на аўсяных палетках; як паспеюць журавіны, ён можа адправіцца і да балота на Баравое. Таму грыбнікам, ягаднікам і турыстам варта ўзмацніць пільнасць і не адпраўляцца ў лес вечарам (летам мядзведзь актыўны ў змрочны і начны час, восенню, у перыяд назапашвання запасаў тлушчу, — большую частку сутак). Звычайна мядзведзі баяцца людзей, яны малаагрэсіўныя і здаюцца непаваротлівымі. Зыход сустрэчы шмат у чым залежыць ад паводзін чалавека.



Летам жа з памежнай вёскі Ласіцк, на поўдні Пінскага раёна, сталі паступаць звесткі, што ў акрузе людзі сталі заўважаць рысь. Лічыцца, што ў тутэйшых краях чырванакніжны драпежнік не водзіцца. Але людзі запэўнівалі, што памылкі быць не можа. Нябачаны раней звер стаў наведвацца на ўскраіну вёскі ўвесну. Яго неаднаразова заўважалі мясцовыя жыхары, прыезджыя рыбакі, паляўнічыя. Аднаму з вяскоўцаў удалося нават сфатаграфаваць рысь у густой траве. Ласіцкі сельвыканкам паведаміў аб незвычайнай жывёліне ў прыродаахоўныя арганізацыі і егерам — перажывалі, каб звер не аказаўся шалёны.

Пінскі раён наведала група навукоўцаў. Экспедыцыя праходзіла на тэрыторыі заказніка «Сярэдняя Прыпяць і Прастыр». Па праекце «Палессе — дзікая прырода без меж» навукоўцы правяралі сітуацыю з папуляцыяй вэртлявай чаротаўкі. Яны пашырылі сваю праграму работы на Піншчыне з-за сітуацыі з выяўленнем рысі. Спецыялісты пагаварылі з відавочцамі, мясцовымі жыхарамі, сустрэліся з уладамі і кіраўніком заказніка, прайшлі па месцах, дзе бачылі рысь. Недалёка ад вёскі знайшлі сляды і месцы ляжанкі начнога драпежніка.

У якасці сховішчаў для адпачынку яна выкарыстоўвае зацішныя месцы. Такія ляжанкі былі выяўлены за Ласіцкім у кірунку да астраўкоў на Ладарож, — распавёў **спецыяліст грамадскай арганізацыі «Ахова птушак Бацькаўшчыны» па прыродаахоўных пытаннях Максім НЯМЧЫНАЎ.** Вырашальную ролю ў выбары месцаў пражывання рысі мае багацце дзічыны, якая служыць ёй ежай, і наяўнасць спакойных участкаў для адпачынку. Апошнім часам на Піншчыне прыкметна павялічылася папуляцыя казулі, на якую палюе драпежнік з сямейства каціных. Акрамя кармавой базы, пад Ласіцкім спрыяльныя ўмовы для адпачынку рысі — лясіста-балоцістая мясцовасць, дзе ціха, спакойна, малалюдна. Традыцыйна месцамі рэгістрацыі рысі ў Брэсцкай вобласці лічацца Брэсцкі, Драгічынскі, Івацэвіцкі, Камянецкі, Пружанскі раёны, з іх з Пінскім мяжуе толькі Івацэвіцкі, ды і то з процілеглага Ласіцку боку — амаль за 100 кіламетраў. Матэрыялы экспедыцыі па слядах «пінскай рысі» перададзены профільным спецыялістам па дзікай прыродзе. Як запэўнілі навукоўцы, вынікі работы адаб'юцца ў навуковым аглядзе па пытаннях месцаў пражывання рысі ў Беларусі.

Трэба сказаць, што нападаў буйных драпежнікаў на людзей у нас даўно не было. Але ж... Трэба ведаць, што ў найбольш зоне рызыкі — грыбнікі і турысты, ды і любы чалавек цалкам выпадкова можа апынуцца сам-насам з драпежнікам. Ратавальнікі распавядаюць, што рабіць і як сябе паводзіць пры такой сустрэчы:

## Рысь

Рысь паводзіць сябе вельмі асцярожна і стараецца ніколі не трапляцца на вочы чалавеку. Нават калі жывёла ўбачыць турыстаў або грыбнікоў, яна не будзе нападаць і палічыць за лепшае застацца незаўважанай. Небяспека існуе толькі ў тым выпадку, калі звер паранены. Прадухіліць нападзенне практычна немагчыма, паколькі рысь звычайна хаваецца ў галінах дрэў і з'яўляецца нечакана.

Тым не менш, не варта забываць, што рысь — гэта тая ж кошка, толькі вялікая, і яна даволі палахлівая. Жывёліну можна прымусіць сысці, актыўна размахваючы рукамі і пры гэтым моцна крычучы.

Калі вы бачыце, што звер аддаляецца, не спрабуйце яго праследаваць — сустрэча можа закончыцца зуім нявесела.

## Лось і зубр

Гэта траваедныя жывёліны, але часцяком яны могуць быць больш небяспечныя для чалавека, чым мядзведзі. Найбольш агрэсіўныя яны падчас шлюбнага перыяду, які звычайна праходзіць у пачатку восені. У дадзенай сітуацыі той жа лось вельмі небяспечны, і значна лягчэй будзе прадухіліць падобную сустрэчу, чым выратавацца.

Калі вы бачыце, што кара на дрэвах абадраная прыкладна на ўзроўні чалавечага росту, значыць, непадалёк ходзіць лось. Распазнаць яго блізкае месцазнаходжанне можна і па памёце на зямлі.

Калі жывёліна вас усё ж убачыла, паспрабуйце схавацца за дрэвам. Як вядома, лось мае дрэнны зрок і можа выпусціць вас з-пад увагі. Не бяжыце: так вы толькі выклічаце ў яго большую агрэсію. Пакуль звер глядзіць на вас, замрыце і не варушыцеся, а калі лось нападае, залезьце на дрэва і дачакайцеся, каб той сышоў.

## Мядзведзь

Па-першае, нельга пакідаць харчовыя адходы ў месцах адпачынку і на дарожках. Рэшткі ежы, хутчэй за ўсё, прыцягнуць мядзведзя. У мядзведзяў вельмі тонкі нюх, і яны адчуваюць пах ежы скрозь тоўсты пласт зямлі і нават металу. Бляшанкі з-пад кансерваў нельга пакідаць у лесе, іх неабходна выносіць з сабой і выкідваць у адпаведныя кантэйнеры.

Па-другое, трэба сачыць, дзе вы разбіваеце лагер. Пажадана гэта рабіць у баку ад сцежак. Мядзведзю ўсё роўна, яго гэта сцежка або чалавечая. У лесе ён гаспадар і вельмі не любіць, калі яму нешта перашкаджае на шляху, асабліва ў вузкіх месцах і на падыходах да месцаў кармлення. Уважліва стаўцеся да выбару месца для лагера. Натуральныя перашкоды, такія, напрыклад, як паваленае дрэва, ручай, стромкі бераг, служаць дадатковай перашкодай для мядзведзя, і ён без лішняй патрэбы пастараецца іх не пераадольваць. Вогнішча і вялікая кампанія ў лагеры таксама ўтрымаюць мядзведзя на адлегласці пры ўмове, што ён зможа абысці лагер бокам.

Па-трэцяе, калі вы рухаецеся па сцежцы, старайцеся выдаваць пабольш гукаў: размаўляйце, стукайце каменем аб камень ці палкай па дрэвах. Справа ў тым, што мядзведзь — вельмі асцярожная жывёла, лішні раз на ражон не палезе. Яму часта хапае проста звычайнага тупату ног, каб пачуць чалавека здалёк і сысці ўбок. Але дадатковыя гукі дапамогуць вам размінуцца з мядзведзем. Наогул жа ў лесе старайцеся трымацца адкрытых месцаў і рэдкалессяў. На адкрытай мясцовасці лягчэй загадзя ўбачыць мядзведзя, чым у зарасніках.

**Што ж рабіць, калі сустрэчы з мядзведзем не ўдалося пазбегнуць?**

Самае галоўнае — не панікаваць ні пры якіх умовах! Мядзведзі не вызначаюцца залішняй агрэсіўнасцю. Чалавек у натуральны рацыён мядзведзя не ўваходзіць. Таму ў большасці выпадкаў дастаткова проста спакойна абысці мядзведзя бокам, трымаючыся на адлегласці, падкрэсліваючы гэтым, што вы не прэтэндуеце на яго жыццёвую прастору. Няма нічога горшага, чым сутыкнуцца са зверам раптам — ён можа ўспрыняць гэта як акт агрэсіі. У рэдкіх выпадках нападаючы мядзведзь можа прыняць чалавека за ежу. Але часцей сустрэчы людзей з мядзведзямі ў нашых лясах заканчваюцца мірна. Найбольшыя непрыемнасці бываюць ад маладых мядзведзяў, якія актыўна даследуюць навакольны свет, а таксама ад самцоў-дамінантаў, якія не маюць ворагаў у дзікай прыродзе і якія забылі, што трэба саступаць дарогу. Калі мядзведзь усё ж такі спрабуе наблізіцца, у 90 % выпадкаў хапае рэзкага свісту або нечаканага пляску ў далоні, каб звер пабег прэч. Калі ён працягвае набліжацца, наступны сродак — кінуць у яго што-небудзь. Як правіла, гэта спрацоўвае. Мядзведзі баяцца ўсяго нечаканага. Напрыклад, нечакана расчыненых парасонаў або нечакана падкінутага ўверх заплечніка.

Не паварочвайцеся да мядзведзя спіной! Не спрабуйце ўцячы ад мядзведзя. Ён бегае хутка, на кароткай дыстанцыі можа прасоўвацца з хуткасцю да 60 км у гадзіну, а ўжо па схіле бегае амаль як вавёрка. Пры блізкім кантакце з мядзведзем старайцеся не глядзець яму ў вочы, у жывёльным свеце гэта азначае выклік. Зрок у мядзведзя прыкладна як у чалавека, але ён больш спадзяецца на нюх і на слых. Калі вецер дзьме ў ваш бок, у вас ёсць шанц прайсці так, што мядзведзь вас проста не заўважыць. Але нават калі ён вас і ўбачыў, але не праяўляе прыкмет агрэсіі, усё роўна спакойна паспрабуйце адысці назад.

Самай небяспечнай для грыбнікоў-ягаднікаў з'яўляецца сустрэча з мядзведзіцай, у якой ёсць медзведзяняты, асабліва калі выпадкова апынуцца паміж імі. Таму як толькі ўбачылі медзведзяня, адразу ж сыходзьце туды, куды яму будзе цяжка за вамі ісці. Медзведзяняты вельмі цікаўныя, а мядзведзіца будзе слепа іх абараняць. І ўжо верхам дурасці будзе спроба падысці да медзведзяняці, каб пагладзіць яго, пагуляць з ім, зрабіць фатаграфію. Нават калі мядзведзіцы не відаць, яна, хутчэй за ўсё, дзесьці паблізу.

Існуе меркаванне, што мядзведзь, устаючы на заднія лапы, выказвае агрэсіўныя намеры. Але на самай справе, часцей за ўсё ён прымае такую позу, каб лепш разгледзець тое, што яго зацікавіла, і папярэдзіць аб сваёй прысутнасці. А вось калі мядзведзь пачынае, гледзячы на вас, прыціскаць вушы, адтапырваць ніжнюю губу і рабіць выпады ў ваш бок, гэта сігнал, што вы парушылі яго тэрыторыю, катэгарычнае патрабаванне «сыходзь». Сыходзіць трэба, не паварочваючыся да мядзведзя спіной, не трэба шумець. Не рабіце рэзкіх рухаў, проста заднім ходам плаўна аддаляйцеся з небяспечнай зоны па дыяганалі, але калі мядзведзь пачынае ісці за вамі, спыніцеся.

Наша парада ў завяршэнне: знаходзячыся ў мядзведжых мясцінах, не забывайце часам азірацца!

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**

# ДУКОРСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ,

***согласно Указа Президента Республики Беларусь от 04.09.2018 г. № 357 «О пустующих и ветхих домах» и решений Пуховичского районного исполнительного комитета от 10 августа 2021 г. № 2789 и № 2790 «О проведении аукциона по продаже пустующего жилого дома»,***

**проводит 14 сентября 2021 года в 15.00 в здании Дукорского сельисполкома, расположенного по адресу: аг. Дукора, ул. Речная, д. 14**

**Пуховичского района Минской области аукцион по продаже гражданам, юридическим лицам и индивидуальным предпринимателям пустующих одноквартирных жилых домов**

| № лота Предмет аукциона | Адрес предмета аукциона | Характеристика предмета аукциона | Характеристика земельного участка | Затраты на организацию и проведение аукциона (рублей) | Начальная цена (рублей) | Задаток (рублей) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Лот № 1 жилой дом | Минская область, Пуховичский район, аг. Дричин, ул. Центральная, д. 56 | Здание одноквартирного жилого дома, материал стен – брус, перекрытия – деревянные, кровля – волнистый шифер, полы – дощатые, окна, двери – деревянные, инженерные коммуникации – электроснабжение | Участок не зарегистрирован | 370,74 + расходы за объявление в СМИ | 4000,00 | 400,00 |
| Лот № 2 жилой дом | Минская область, Пуховичский район, д. Белое, д. 17 | Здание одноквартирного жилого дома, материал стен – брус, перекрытия – деревянные, кровля – волнистый шифер, полы – дощатые, окна, двери – деревянные, инженерные коммуникации – электроснабжение | Участок не зарегистрирован | 370,74 + расходы за объявление в СМИ | 2000,00 | 200,00 |

Желающим участвовать в аукционе необходимо внести соответствующий размер задатка на р/с BY23AKBB36006250900060000000, УНП 600537220, код платежа 04706.

Получатель: Главное управление Министерства финансов Республики Беларусь по Минской области. Банк: ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, BIC AKBB BY2X.

**Участники аукциона должны предоставить следующие документы:**

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме.
2. Копии платежных документов, заверенных банком, подтверждающих внесение задатка на расчетный счет продавца.
3. Физическим лицам – документ, удостоверяющий личность (паспорт) покупателя или его доверенного лица, и доверенность, заверенную нотариально в случае, если интересы покупателя представляет это лицо).
4. Юридическим лицам – документ, удостоверяющий личность (паспорт), доверенность на участие в аукционе и на подписание документов; копии Устава, учредительных документов, свидетельство о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов, копию свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования.
5. Заключить соглашение с Дукорским сельским исполнительным комитетом.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются до **17.00 08 сентября 2021 года по вышеуказанному адресу.**

Аукцион состоится по каждому лоту при наличии не менее двух участников.

Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на предоставление предмета аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан:

- в течение 10 (десяти) рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за предмет аукциона и расходы по организации и проведению аукциона, затраты на публикацию информационного сообщения;
- обратиться в Дукорский сельский исполнительный комитет для принятия решения об изъятии и предоставления земельного участка, на котором расположен жилой дом.

Участники аукциона предварительно могут ознакомиться с предметом аукциона и документацией. Осмотр осуществляется претендентами на участие в аукционе в сопровождении специалиста Дукорского сельисполкома в согласованное время (рабочие дни), в течение установленного срока приема документов.

Контактные телефоны: **(801713) 63935, 99436, 99322.**

---

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор аукциона)
**извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества ОАО «ДСТ-1, г. Витебск»** (Продавец)

**Лот № 1, состав:** 1. Административное здание, инв. № 230/С-8322, 1271 кв. м; 2. КПП АБК, инв. № 230/С-12707, 4,7 кв. м; 3. Здание ремонтной мастерской, инв. № 230/С-13079, 1651,4 кв. м; 4. Здание пилорамы, инв. № 230/С-13087, 134,9 кв. м; 5. Здание склада столярного цеха, инв. № 230/С-13083, 37 кв. м; 6. Здание заправочной, инв. № 230/С-13084, 5,3 кв. м; 7. Насосная станция, инв. № 230/С-12706, 8,4 кв. м; 8. Навес для хранения твердого топлива, инв. № 230/С-11762, 99,7 кв. м; 9. Водопроводная сеть, инв. № 230/С-11758; 10. Хозбытовая канализационная сеть, инв. № 230/С-11759; 11. Электрическая сеть, инв. № 230/С-11760; 12. Артезианская скважина, инв. № 230/С-12704; 13. Гараж, котельная, инв. № 230/С-8321, 869,3 кв. м.

**Адреса:** поз. 1 – Витебская обл., Лепельский р-н, г. Лепель, ул. Минское шоссе, 31; поз. 2–13 – Витебская обл., Лепельский р-н, г. Лепель, Минское шоссе, 157 км.

Начальная цена с НДС – 894 667,20 бел. руб.
Задаток – 90 000,00 бел. руб.
Штраф – 50 000,00 руб. Шаг аукциона – 5 %.

**Аукцион состоится 30.08.2021 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.**

Порядок оформления участия в аукционе, условия аукциона и полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона **ino.by.**

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 ОАО «Белагропромбанк», г. Минск ул. Романовская Слобода, 8, BIC банка BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Первое полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Республика» от 30.05.2019 № 98.

Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков – **26.08.2021 г. в 11.00.**

**☎ Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,**
**8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182

---

Утерянные представительством Белгосстраха по Ленинскому району г. Минска бланки полиса по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БЛБ № 3041726–3041727 **считать недействительными.**

УНП 100122726

---

# ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY**.

Продавец: **Государственное предприятие «Слава труду»** (УНП 500056012), 231482, Гродненская обл., Дятловский р-н, г. п. Козловщина, ул. Советская, 74а, тел./факс (01563) 30-1-95, в лице антикризисного управляющего частного предприятия «Правовой путь».

Повторные публичные торги в форме аукциона в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) будут проведены **02 сентября 2021 г. в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28.

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена предмета торгов, бел. руб. без НДС |
|---|---|---|
| 1 | Водонапорная башня, Гродненская обл., Дятловский р-н, г. п. Козловщина | 123,25 |
| 2 | Котельная клуба, Гродненская обл., Дятловский р-н, д. Денисово | 265,17 |
| 3 | Реконструкция убойного цеха, Гродненская обл., Дятловский р-н, Подвеликое | 1 365,47 |
| 4 | Модернизация сушилки, Гродненская обл., Дятловский р-н, Скипоровичи | 1 863,24 |
| 5 | Реконструкция комплекса (4 телятника), Гродненская обл., Дятловский р-н, Подвеликое | 44 030,15 |
| 6 | Реконструкция молочнотоварной фермы, Гродненская обл., Дятловский р-н, Подвеликое | 130 809,24 |

Тел. для ознакомления и осмотра +37529 698-53-53.

**Для участия в торгах необходимо в срок** с 18.08.2021 г. 09.00 по 01.09.2021 г. 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за пять дней до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан оплатить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, и аукционный сбор в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Срок заключения договора купли-продажи: не позднее 14 календарных дней со дня проведения торгов. Срок оплаты предмета торгов: не позднее 30 календарных дней со дня проведения торгов. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Звязда» от 13.07.2021 г.

---

# ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО «ДОРОЖНО-СТРОИТЕЛЬНЫЙ ТРЕСТ № 3»

**02 сентября 2021 года в 11.00** проводит повторный открытый аукцион по продаже имущества

| № п/п | Сведения о предмете аукциона | Начальная цена продажи со снижением на 20 % без НДС, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| Лот № 1 | Прицеп специальный самосвал MAZ 856100, 2010 г. в., инвентарный номер 1972 | 7280,00 | 728,00 |
| Лот № 2 | Прицеп специальный самосвал MAZ 8561, 2010 г. в., инвентарный номер 1974 | 7280,00 | 728,00 |
| Лот № 3 | Полуприцеп специальный самосвал MAZ 9506 010, 2005 г. в., инвентарный номер 1980 | 7360,00 | 736,00 |
| Лот № 4 | Автомобиль легковой специальный седан FORD MONDEO, 2003 г. в., инвентарный номер 1437 | 4400,00 | 440,00 |

1. Наименование продавца – организатора аукциона, его место нахождения и контактные телефоны: ОАО «ДСТ № 3», г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, тел.: 23-64-24, 28-41-00.
2. Дата, время и место проведения аукциона: **02 сентября 2021 года в 11.00** по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, каб. 34.
3. Порядок, в соответствии с которым проводится аукцион: Положение о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества, находящегося в собственности ОАО «ДСТ № 3» от 13.04.2017 г. При подаче заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, подписывает с ОАО «ДСТ № 3» соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.
4. Участник аукциона за 3 дня до проведения аукциона должен перечислить организатору аукциона задаток в размере 10 % от первоначальной стоимости без НДС.

Реквизиты текущего (расчетного) счета, на который должна быть перечислена сумма задатка: р/с BY54BPSB30121192410119330000, код BPSBBY2X в региональной дирекции № 600 ОАО «БПС-Сбербанк», УНП 700049607, ОКПО 03454762.

5. Место, дата и время окончания приема заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами: 212022, г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, кабинет 33; дата: 31.08.2021 г., время: 17.00.
6. Срок возможного снятия имущества с аукциона: за 3 дня до даты проведения аукциона.
7. Сроки подписания договора купли-продажи: договор купли-продажи имущества должен быть подписан победителем аукциона (претендентом на покупку) в редакции организатора аукциона после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона и предоставления организатору аукциона копий платежных документов, но не позднее 5 рабочих дней. Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона: в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола.
8. Извещение о проведении открытого аукциона по продаже имущества ОАО «ДСТ № 3» размещены в газете «Звязда», на сайте ОАО «ДСТ № 3».

---

# ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО «ДОРОЖНО-СТРОИТЕЛЬНЫЙ ТРЕСТ № 3» – продавец (организатор аукциона)

**30 августа 2021 года в 11.00** проводит повторный открытый аукцион по продаже имущества

| | Сведения о предмете аукциона | Начальная цена продажи со снижением на 40 % без НДС, бел. руб. | Место нахождения имущества | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| Лот № 2 | Погрузчик «АМКОДОР 332С4», тип транспортного средства – погрузчик фронтальный, 2006 год выпуска, инвентарный номер 794 | 14 220,00 | Могилевская область, г. Горки, ул. Мира, 20 | 1422,00 |

1. Наименование продавца – организатора аукциона, его место нахождения и контактные телефоны: ОАО «ДСТ № 3», г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, тел.: 23-64-24, 28-41-00.
2. Дата, время и место проведения аукциона: **30 августа 2021 г. в 11.00** по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, каб. 34.
3. Порядок, в соответствии с которым проводится аукцион: Положение о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества, находящегося в собственности ОАО «ДСТ № 3» от 13.04.2017 г.

При подаче заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, подписывает с ОАО «ДСТ № 3» соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

4. Реквизиты текущего (расчетного) счета, на который должна быть перечислена сумма задатка: р/с BY54BPSB30121194101193300000, код BPSBBY2X в региональной дирекции № 600 ОАО «БПС-Сбербанк», УНП 700049607, ОКПО 03454762.
5. Место, дата и время окончания приема заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами: 212022, г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, кабинет 33; дата: **27.08.2021 г.; время: 17.00.**
6. Срок возможного снятия имущества с аукциона: за 3 дня до даты проведения аукциона.
7. Сроки подписания договора купли-продажи: Договор купли-продажи имущества должен быть подписан победителем аукциона (претендентом на покупку) в редакции организатора аукциона после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона и предоставления организатору аукциона копий платежных документов, но не позднее 5 рабочих дней. Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона: в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола.
8. Извещение о проведении открытого аукциона по продаже имущества ОАО «ДСТ № 3» размещены в газете «Звязда», на сайте ОАО «ДСТ № 3».

---

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор аукциона)
**информирует о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества УП «МИНСКЗЕЛЕНСТРОЙ»** (Продавец)

## ЛОТ № 1: АТТРАКЦИОН «КЛОУН»,

**зав. № 73, инв. № 00051340, демонтирован.**

Начальная цена с НДС – 7 495,66 руб.
Местонахождение: г. Минск, ул. Фрунзе, 2.

Аукцион состоится **01.09.2021 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, каб. 4.

Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь **gki.gov.by**, Минского городского исполнительного комитета **https://minsk.gov.by**, Организатора аукциона **ino.by.**

**☎ Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,**
**8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182

---

УНП 190398583

**Коммунальное унитарное предприятие**
**«Минский городской центр недвижимости»**

сообщает о внесении следующих изменений в извещение (информацию) о проведении 24 августа 2021 года 312-го открытого аукциона по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машиномест, их частей, находящихся в государственной и иной собственности (опубликовано в газете «Звязда» 24.07.2021):

**предметы аукциона № 61–63 исключаются из текста публикации в связи с отказом арендодателя от проведения аукциона.**

Телефон для справок +375 (17) 360 42 22. Адрес в сети интернет: www.mgcn.by

---

Утерянные филиалом Белгосстраха по г. Минску бланки страховых свидетельств по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории РБ серии ВВ № 3526575, 5273199, 5294429, 7536338, 8355440, 9347338, 9368279, серии ВА № 0686456, 0759811, 2483184, 4137671, 6281268, 6360793 **считать недействительными.**

УНП 100122726

# РЫХТУЙ ДРОВЫ І ПРАВАДЫ ЛЕТАМ

## 89 ПАКАЗЧЫКАЎ ГАТОЎНАСЦІ

Падрыхтоўка да сёлетняй зімы вядзецца ў адпаведнасці з Пастановай Саўміна № 351, нагадаў **Андрэй РАМАШКА, начальнік упраўлення жыллёвай гаспадаркі Мінжылкамгаса.** Гатоўнасць аб'ектаў ЖКГ штотыдзень кантралюецца па 13 асноўных паказчыках, такіх як замена і капрамонт катлоў, замена цеплясетак, стварэнне запасаў драўнянага паліва, прафілактычны рамонт сістэм ацяплення жылля і цеплапунктаў, рамонт стыкаў і дахаў. Штомесяц правяраюцца 89 паказчыкаў, накшталт работ па выпрабаванні абсталявання кацельных і цеплясетак, рамонту абсталявання кацельных, прафілактычнага агляду і рамонту водаправодных і каналізацыйных сетак і збудаванняў, рамонту электраабсталявання жылля і печаў, паверкі прыбораў уліку і іншага.

— *Гэтыя мерапрыемствы гарантуюць надзейнае, бесперабойнае і безаварыйнае цепла- і водазабеспячэнне жылля і забеспячэнне функцыянавання інфраструктуры гарадскіх і сельскіх населеных пунктаў у ацяпляльны перыяд,* — упэўнены спецыяліст. — *За першае паўгоддзе выпрабавана абсталяванне больш як 2300 кацельных, 10 200 кіламетраў цеплясетак, адрамантавана абсталяванне звыш 2120 кацельных і 1100 цэнтральных цеплапунктаў, ачышчана ўнутраная паверхня амаль 1580 катлоў і 750 бойлераў.*

За гэты час перакладзены 144 кіламетры водаправодных сетак і амаль 60 кіламетраў — каналізацыйных. Прамыта каля васьмі тысяч кіламетраў сеткі водаправоду і звыш трох тысяч — каналізацыі. Адрамантавана каля чатырох тысяч калонак, больш за 350 артэзіянскіх свідравін і 350 каналізацыйных помпаў.

На сярэдзіну лета пашпарты гатоўнасці да зімы атрымалі 228 кацельных і 50 спажыўцоў цеплаэнергіі. У краіне нарыхтавана 815 тысяч шчыльных м³ драўнянага паліва, у тым ліку 604 тысячы м³ дроў і 211 м³ шчэпак. Заменена 219 кіламетраў цеплясетак. Прафілактычны рамонт сістэм ацяплення выкананы ў 29,7 тысячы дамоў і 27,3 тысячы цеплапунктаў. Апрасавана каля 30 тысяч сістэм ацяплення жылля і 27,9 цеплапунктаў. Адрамантавана 203 пагонныя метры стыкаў панэляў і 505 тысяч м$^2$ даху, удакладніў Андрэй Рамашка.

## «ЗІМОВЫЯ» ПАШПАРТЫ ДЛЯ СПАЖЫЎЦОЎ І КРЫНІЦ ЦЯПЛА

На абслугоўванні жыллёвых арганізацый Мінскай гарадской жыллёвай гаспадаркі знаходзяцца 6400 дамоў. Да зімы ў іх трэба выканаць прафрамонт сістэм

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

ацяплення, электразабеспячэння, адладжванне сістэм ацяплення і цеплавузлоў, гідрапрамыўку сістэм ацяплення, прамыўку сістэм водазабеспячэння. Усе гэтыя мерапрыемствы амаль цалкам выкананыя, заўважыў **Вячаслаў БАТУРА, намеснік гендырэктара па эксплуатацыі жылфонду і вытворчых пытаннях Мінскай гарадской жыллёвай гаспадаркі:**

— *Сёлета быў запланаваны рамонт 207 воданагравальнікаў, 290 павышальных помпаў, аднаўленне цеплаізаляцыі трубаправодаў на 529 м³, рамонт 310 тыся м² даху, 142 тысяч м² стыкаў сценавых панэляў, больш як 15,5 тысячы пагонных метраў водаадводзячых сістэм, 1353 балконы. Запланавана замена 78 цеплаабменнікаў і 135 сістэм рэгулявання цеплавузлоў.*



Пашпарты гатоўнасці да работы ў асенне-зімовы перыяд павінны атрымаць 29 109 спажыўцоў цеплаэнергіі і 10 315 цеплакрыніц краіны. Для гэтага павінны быць выкананы адпаведныя патрабаванні, аднак падчас праверак высвятляюцца недахопы, заўважыў **Сяргей СТАСЕНКА, начальнік аддзела цеплатэхнічнай інспекцыі Дзяржэнергагагляда:**

— *Адносна цеплатэхнічнага абсталявання гэта адсутнасць цеплавой ізаляцыі, гідраўлічных выпрабаванняў і гідрапнеўматычных прамывак. Адносна газу часта адсутнічаюць акты праверкі тэхнічнага стану дымавых і вентыляцыйных каналаў.*

## УБОРКА ПРАСЕК І НАДЗВЫЧАЙНЫЯ СІТУАЦЫІ

Энергетыкі таксама рыхтуюцца да зімы. У галіне зацверджаны арганізацыйна-тэхнічныя мерапрыемствы, якія ствараюць устойлівае і надзейнае энергазабеспячэнне, вызначаючы аб'ёмы работ па замене і будаўніцтве цеплясетак і ствараемых запасаў паліўнага мазуту. Створаны часовыя рабочыя групы па забеспячэнні рацыянальных рэжымаў цеплазабеспячэння спажыўцоў, эканомным выкарыстанні паліўна-энергетычных рэсурсаў, акрэсліў **Яўген ПАНЦЯЛЕЙ, намеснік галоўнага інжынера аб'яднання «Белэнерга»:**

— *На сярэдзіну лета адрамантавана больш за 45 % ад запланаванага на год. 22 адзінкі*



Фота аўтара.

*цеплатэхнічнага абсталявання і 91 адзінка электратэхнічнага абсталявання капітальна рамантуюцца. Капітальна рамантуюцца электрасеткі ўсіх класаў напружання. Заменена звыш 60 % апор напружаннем 10 кВ і амаль 65 % проваду. Звыш 55 % неізаляванага проваду заменена засцерагальным. Расчышчаюцца прасекі ліній напружаннем 10-750 кВ на 8 тысячах гектараў, наводзіцца парадак у палосах лесу, якія прылягаюць да гэтых прасек. Заменена і зманціравана палова цеплясетак, назапашана каля 330 тысяч тон мазуту.*

«Белэнерга» займаецца таксама папярэджаннем пажараў, для чаго правярае працаздольнасць сістэм дымавыдалення, пажарнай аўтаматыкі і аб'ектаў супрацьпажарнага водазабеспячэння. Каля пажарных вадаёмаў і пляцовак створаны пад'езды і пляцоўкі для ўстаноўкі тэхнікі, кантралюецца пастаянная наяўнасць у іх вады. За своечасовае прыняцце неадкладных мер па ліквідацыі ўзнікаючых пажараў прадугледжана персанальная адказнасць работнікаў. Адпрацаваны парадак работы аператыўных груп у надзвычайным рэжыме ва ўмовах нізкіх тэмператур. Да асенне-зімовага перыяду ўжо скамплектаваны 1429 падраздзяленняў (больш за 7300 чалавек) для выканання аварыйна-аднаўленчых работ. Напагатове каля 200 дызельных электрастанцый.



Фота з сайта gorod214.by

## ПРАВЯРАЙ У КВАТЭРЫ ГАЗ

Спецыялісты газавай галіны ў межах падрыхтоўкі да ацяпляльнага сезона нарыхтавалі 410 тысяч тон паліўнага брыкету. Газавікі даследавалі больш за 4,5 тысячы кіламетраў падземных газаправодаў, замянілі каля 200 адзінак абсталявання, якія працуюць больш за 20 гадоў, і больш як 82,5 тысячы адзінак маральна ўстарэлага абсталявання. Ацанілі стан каля 400 кіламетраў падземных газаправодаў з тэрмінам службы звыш 40 гадоў. Усе гэтыя мерапрыемствы скіраваны на стабільную работу газазабеспечвальнай галіны, запэўніў **Дзмітрый ЛАБЫКА, начальнік упраўлення тэхнічнага прагрэсу НДР, энергаэфектыўнасці і эксплуатацыі абсталявання агульнага назначэння аб'яднання «Белпалівагаз»** і дадаў, што асаблівая ўвага аддаецца пытанням бяспекі пры выкарыстанні ўнутрыдамовага і ўнутрыкватэрнага газавага абсталявання.

Сёлета праверана тэхнічны стан каля 500 тысяч адзінак газавыкарыстальнага абсталявання, ёсць выпадкі адключэння катлоў і калонак.

— *Пераважна адключалі абсталяванне праз парушэнне спажыўцамі правілаў выкарыстання газу ў быце, у прыватнасці, неправядзенне своечасовага планавага тэхнічнага абслугоўвання, адсутнасць актаў праверкі тэхстану дымавых і вентыляцыйных каналаў або іх няспраўнасць,* — абазначыў спецыяліст.

**Ірына СІДАРОК, фота аўтара.**

---

Спажывец

# Умець абараніць свае правы

**Больш за пяць тысяч зваротаў, звязаных з парушэннем правоў спажыўцоў, разгледжана Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю разам з выканкамамі ў першым паўгоддзі 2021 года.**

Адзначаецца павелічэнне колькасці зваротаў, разгледжаных выканкамамі Гомельскай, Мінскай, Магілёўскай абласцей, адміністрацыямі раёнаў Мінска і Мінскім гарвыканкамам. Найбольшая колькасць зваротаў разгледжана Мінскім гарвыканкамам і адміністрацыямі раёнаў Мінска — 36 % ад агульнай колькасці разгледжаных, выканкамамі Магілёўскай вобласці — 15 %, Брэсцкай — 11 %, Мінскай — 10 %, астатнімі — менш за 9 %.

Па-ранейшаму сферай дзейнасці, на якую ў большай ступені скардзяцца спажыўцы, застаецца рознічны гандаль, у тым ліку продаж тавараў з дапамогай інтэрнэт-крамаў. У першым паўгоддзі 2021 года пытанняў, звязаных з продажам тавараў, паступіла 40 % ад агульнай колькасці зваротаў; 28 % зваротаў датычыліся абароны правоў спажыўцоў у сферы аказання жыллёва-камунальных паслуг; 8 % — бытавога абслугоўвання насельніцтва і паслуг сэрвісных цэнтраў; 14 % — паслуг перавозчыкаў аўтамабільным транспартам, медыцынскіх, транспартных, турыстычных, паслуг сувязі і іншых; 2 % — паслуг грамадскага харчавання, 8 % — іншых.

Па выніках разгляду пісьмовых і электронных зваротаў спажыўцам кампенсавана матэрыяльнага ўрону ў дасудовым парадку на суму 373,9 тысячы рублёў. А вось па незадаволеных у дасудовым парадку пытаннях выканкамамі было пададзена 80 позваў у суд аб абароне правоў спажыўцоў.

У мэтах абароны парушаных правоў спажыўцоў складзены 241 пратакол аб адміністрацыйных правапарушэннях, вынесена 130 прадпісанняў аб спыненні парушэнняў правоў спажыўцоў.

Найбольш часта грамадзяне звярталіся па пытаннях, звязаных з набыццём нехарчовых тавараў (мабільных тэлефонаў, бытавой тэхнікі, мэблі і іншага) неналежнай якасці, і (або) немагчымасцю іх вяртання; парушэннем тэрмінаў перадачы папярэдне аплачанага тавару; прадастаўленнем недакладнай інфармацыі пра тавары, работу, паслугі, у тым ліку на сайтах інтэрнэт-крамаў, а таксама звязаных з немагчымасцю вяртання тавараў належнай якасці, набытых падчас правядзення прэзентацый і рэкламных акцый; парушэннем прадаўцамі інтэрнэт-крамаў устаноўленых заканадаўствам тэрмінаў вяртання грашовых сродкаў за тавар належнай або неналежнай якасці; набыццём тавараў у сацыяльных сетках; якасцю ўстаноўкі дзвярэй і вокнаў, вырабам мэблі і парушэннем тэрмінаў выканання дагаворных абавязацельстваў, ліквідацыяй недахопаў аказанай паслугі (выкананай работы); дакучлівай прапановай суб'ектаў гаспадарання заключыць дагавор на выкананне работ па чыстцы вентыляцыі ў кватэры.

Для павышэння ўзроўню прававой адукаванасці і інфармаванасці грамадзян аб іх спажывецкіх правах, тлумачэння заканадаўства і праваприменяльнай практыкі МАРГ у красавіку стварыў Telegram-канал «МАРГ аб правах спажыўцоў».

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

# СПАС — УСЯМУ ЧАС

## У Слаўгарадскім раёне на Блакітнай крыніцы спявалі, спрабавалі мёд і лячыліся гаючай вадой

**Рэгіянальнае свята «Макавей» на Блакітнай крыніцы супадае з пачаткам Успенскага посту і святкаваннем Паходжання дрэў Жыватворнага Крыжа Гасподняга. У народзе гэты дзень называюць яшчэ і Мядовым Спасам. Таму на «Макавея» збіраюцца пчаляры з розных абласцей Беларусі. Апошнім часам на Блакітнай крыніцы наогул рэдка бывае бязлюдна. Гледзячы па аўтамабільных нумарах, часцей за ўсё тут гасцююць турысты і паломнікі з Гомельскай і Магілёўскай абласцей. Але 13 і 14 жніўня наплыў людзей быў такі вялікі, што немаленькія па памерах аўтапляцоўкі трашчалі па швах. У суботу чарга з машын у напрамку да крыніцы расцягнулася на некалькі кіламетраў. У звычайны дзень гэты шлях можна пераадолець за 10 хвілін, але на «Макавея» тут утварыўся такі затор, што ахвотныя стаялі з паўгадзіны і больш. Потым яшчэ трэба было выстаяць чаргу па ваду. Нездарма старыя людзі казалі, што, каб атрымаць ласку Боскую, яе трэба заслужыць.**



Уладзіслаў Сямёнавіч, Ніна Афанасьеўна, Наталля Уладзіміраўна — разам прадалі звыш 60 кілаграмаў сырных прысмакаў.

Самыя вынаходлівыя прыехалі на крыніцу ў пятніцу вечарам. Якраз была магчымасць далучыцца да богаслужэння і паўдзельнічаць у агульнай малітве.

— Мне падабаецца быць тут вечарам, калі богаслужэнне заканчваецца, свечкі гараць, ціха, як на Вялікдзень, — расказвае **айцец АФАНАСІЙ**. — І нават тыя, хто прыйшлі не на богаслужэнне, а проста адпачыць, прыціхлі. Тутэйшая капліца асвячоная ў гонар свя-



Тату ад Дзіяны ДАРОШЧАНКІ — ноу-хау раённага гісторыка-краязнаўчага музея.

тых пакутнікаў Макавеяў. Памяць пакутнікаў — гэта дзень хрышчэння шматлікіх славянскіх плямёнаў, у тым ліку радзімічаў. Яны тут хрысціліся, таму і нас таксама сюды цягне. І не толькі радзімічаў.

Раніцай вакол капліцы яблыку не было дзе ўпасці. Тут маліліся на Боскай літургіі, асвячалі мёд, пакланяліся Жыватворнаму Крыжу, славілі Бога ў Хрэсным ходзе.

А потым з пачуццём выкананага абавязку далучаліся да шумнага кірмашу і падпявалі калектывам мастацкай самадзейнасці. На тутэйшай сцэне пад адкрытым небам адбыўся восьмы па ліку абласны конкурс «Спас — усяму час».

— Традыцыя выканання народных песнапенняў заўсёды была, — заўважыў айцец Афанасій. — Але раней, акрамя народных песень, спявалі псалмы. Гэта духоўныя вершы, своеасаблівая малітва, але на простым, вясковым узроўні. Простыя словы, але вельмі кранаюць душу. І хочацца, каб у рэпертуары мастацкіх калектываў таксама было іх паболей.

На Магілёўшчыне шмат сапраўдных самародкаў. У складзе калектыву «Спадчына» Забялышанскага Дома культуры, што на Хоцімшчыне, прыехаў Ігар Абушкевіч, якога калісьці запрашаў да сябе ў калектыў сам Уладзімір Мулявін.

— Мы тады выступалі на граніцы Беларусі з Расіяй, каля помніка кавалерыстам, а калі канцэрт скончыўся, да мяне падышоў мужчына і сказаў, што ён з «Песняроў», — згадвае суразмоўнік той выпадак. — Прапанаваў праспяваць некалькі куплетаў з «Песняроў». Паслухаў і сказаў, што я ім падыходжу. Я тады вялікай увагі гэтаму не надаў і паехаў дадому. А на наступны дзень землякі, якія вечарам былі ў Хоцімску на канцэрце «Песняроў», перадалі, што Уладзімір Мулявін цікавіўся, ці ёсць я ў зале. А потым папрасіў перадаць, каб я звязаўся з імі, маўляў, яны мяне бяруць. Але ў мяне ўжо былі сям'я і дзеці, я будаваў сабе дом, таму не рызыкнуў ехаць у Мінск.

У конкурсе бралі ўдзел 12 калектываў з Магілёўскай і Гомельскай абласцей.

— Калі фестываль толькі нараджаўся як мерапрыемства, мы ўсё думалі, што б такое турыстам пра нас расказаць, — падзялілася **старшыня Слаўгарадскага райсавета дэпутатаў Святлана ЯЗЕРСКАЯ**. — Да абеду ідзе богаслужэнне, а потым наступае час для спеваў. Цяпер фестываль стаў рэгіянальным і пазіцыянуе сябе як свята народнай творчасці рэгіёна. Сюды прыязджаюць не толькі артысты, але і вядомыя майстры дэкаратыўна-прыкладной творчасці. Наша крыніца аб'ядноўвае вакол сябе ўсіх.

Напрыклад, Слаўгарадская цэнтральная раённая бібліятэка арганізавала тэматычную выставу «Блакітны скарб Пасожскага краю», на якой прадставіла больш за дзесяць розных крыніц, вадаёмаў і рачулак Слаўгарадскага раёна.

— Агульная тэрыторыя, якую займаюць гэтыя водныя багацці, складае 1113 гектараў, — падзялілася **бібліёграф Алена ДРАЗДОВА.** — Самае вялікае возера — Кульшацкае, самае папулярнае штучнае — Маладзёжнае ў Слаўгарадзе. Мы сабралі паданні і гісторыі пра паходжанне вадаёмаў. І, натуральна, пра Блакітную крыніцу, якую паломнікі ведаюць як цудатворную.

На свяце працавалі тэматычныя пляцоўкі, было шмат самаробнага сыру і мёду. Свойскі сыр прывезлі з Крычава і Антон з Вікторыяй Студневы. Іх сялянска-фермерская гаспадарка спецыялізуецца непасрэдна на сырнай дзейнасці. Сям'я трымае пяць кароў, а вопыт пераймала ў слаўгарадскіх сыравараў. Апошнія, дарэчы, па іх жа словах, прадалі на фэсце не менш за 100 кілаграмаў сыру. Заўважылі, што сярод пакупнікоў былі госці з Эстоніі і Латвіі.

Шмат было і мёду — ліпавага, з акацыі, кветкавага, з пяргой, у сотах — адным словам, на любы густ. Сяргей і Святлана Канатавы — пчаляры з Мсціслава.

— Заўсёды лічылася, што пасля Мядовага Спасу мёд набывае сілу і становіцца спелы, — паведаміў Сяргей. — Гэта не значыць, што дасюль ён быў дрэнны, проста ён цяпер яшчэ і асвячоны. Бацюшка яго асвяціў і цяпер ён па-сапраўднаму лячэбны.

Мёд у гэты дзень ішоў «на ўра». Алена з Юрыем і дачкой Янінай прыехалі з Мінска ўпершыню, бо шмат што чулі пра гэта свята ад родных з Быхава.

— Тройчы, як трэба па легендзе, перайшлі асвячоную крыніцу, — адразу ж далі справаздачу сужэнцы. — Вада такая халодная, што сэрца заходзіцца. Але потым так цёпла стала і хораша на душы. Калі шчыра, не чакалі, што тут будзе такое вялікае свята. Ужо паўдня тут, а ўсе рады яшчэ не абышлі. І мёд вельмі смачны. Павязём яго да сябе ў Мінск, будзем частаваць знаёмых.

**Нэлі ЗІГУЛЯ, фота аўтара.**



# 13 — ШЧАСЛІВАЯ ЛІЧБА!

## У Віцебску ў мінулую — адзіную ў бягучым годзе! — пятніцу 13-га ў гістарычным цэнтры горада было вельмі весела

**Іншагароднім напярэдадні ўнікальнага мерапрыемства было цяжка растлумачыць, што гэта наогул такое. Між тым, паглядзець на бясплатнае шоу «Музычнаму клоўну — 13!» каля Летняга амфітэатра, якое пачалося, вядома ж, у 13 гадзін, прыйшло і прыехала здалёк некалькі сотняў чалавек.**



Фота Алега КЛІМОВІЧА.

13 гадоў таму каля галоўнай сцэнічнай пляцоўкі міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» ўсталявалі скульптурную кампазіцыю: увекавечылі ў метале клоуна, які грае на гармоніку, і пудзеля — яго партнёра і сябра. Задуму ўвасобіў віцебскі скульптар Іван Казак.

Арт-аб'ект адразу стаў вельмі папулярны сярод тутэйшых і прыезджых. І без традыцыйных «маніпуляцый» не абыходзіцца. У Віцебску труць лапку сабаку — каб было больш верных сяброў, абутак клоуна — каб не стаміцца ў дарозе, вярнуцца зноў у старажытны горад, кашалёк — каб было больш грошай...

Гэтую прыгажосць падарыў гораду заслужаны артыст Расіі Мікалай Чалнакоў. Ён быў аўтарам ідэй, прадзюсарам, кіраўніком многіх цыркавых праектаў. Шоу ў Віцебску ў гонар лічбы 13 прайшло, як той казаў, на адным дыханні. Ад будынка гарадскога загса (вуліца Леніна, 5) Чалнакоў праехаўся на маленькім цыркавым ровары. Супрацоўнікі ДАІ для гэтага перакрылі рух. Потым вясёлы клоўн папрасіў дзятву дапамагчы яму даехаць да скульптуры «Музычны клоўн» (на праспект Фрунзэ). Там і адбыліся галоўныя падзеі перформансу для дзяцей і дарослых. Цыркач весяліў прысутных нават з даху мікрааўтобуса, якая раптоўна стала сцэнай. Асабліва падабалася публіцы, калі Мікалайператвараў людзей з натоўпу ва ўдзельнікаў спектакля. У прыватнасці, артыст запрасіў да ўдзелу ў выступленні старшыню Віцебскага гарадскога выканаўчага камітэта Мікалая Арлова, вядомага як выдатнага спартсмена.

Каля гадзіны доўжылася дзея, падчас якой бурныя апладысменты гучалі не раз. Пасля вулічнага шоу ўсіх запрасілі на экспазіцыю з малюнкамі дзяцей, прысвечанымі клоўнам.

Дарэчы, вядома, што сярод тысяч фобій існуе тая, што датычыцца лічбы 13 і асабліва ў спалучэнні яе з пятніцай. Па тэрапію, калі ласка, — да віцебскага клоўна!

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

І мы там былі

# НЯСВІЖСКАЯ ФАРТЭЦЫЯ,

## дзе ў адно цэлае зліліся гісторыя, культура і музыка

**Больш за пяць тысяч чалавек сабраў фестываль гістарычнай рэканструкцыі, культуры і музыкі «Нясвіжская фартэцыя», які праходзіў 14-15 жніўня на тэрыторыі Англійскага парку палацава-паркавага комплексу «Нясвіж». А прысвечана свята было самым значным падзеям XVII—XVIII стагоддзяў. Тут таксама былі прадстаўлены эпоха Сярэднявечча і рэканструкцыя падзей 1812 года.**



Фота Рамана КЛЮЧЫНА.

У поўнай экіпіроўцы прайшліся перад шматлікімі гасцямі рыцары, грэнадзёры, гусары, пехацінцы. На тэрыторыі Англійскага парку былі ўладкаваны шатры ўдзельнікаў клубаў рэканструктараў. Тут можна было даведацца пра быт нашых продкаў, як яны адзяваліся, што елі, якія ўпрыгажэнні насілі тагачасныя дамы. Удзельнікі клубаў шчодра дзяліліся з усімі рэдкімі і цікавымі фактамі. Напрыклад, тым, што абутак вызначаў статус рыцара, шляхціча. Чым больш выкарыстана пры вырабе ботаў натуральнай скуры, тым больш багаты і заможны быў чалавек. У той жа час на пехацінцы, які ваяваў пад харугвай Януша Радзівіла, было па мінімуме жалеза, а вопратка была зручная і камфортная пры любым надвор'і. Яе ўладальніку не былі страшныя ні дождж, ні снег, ні сцюжа.

З цікавасцю госці назіралі за захапляючымі сцэнамі, што змянялі адна адну — гістарычныя падзеі, ваенныя кампаніі, гарадскі і паходны быт шляхецкіх саслоўяў, ваенна-гістарычныя рэканструкцыі (манеўры, турніры, бітвы, паядынкі, конны рыцарскі турнір, паказальныя выступленні). Усяго ж у фестывалі ўзялі ўдзел дваццаць клубаў рэканструктараў Беларусі.

Удзельнікамі і гледачамі свята сталі не толькі жыхары Нясвіжа, раёна, але і шматлікія госці з іншых абласцей і куткоў краіны. Многія прыехалі цэлымі сем'ямі, з дзецьмі. «Я прывезла сваіх школьнікаў-падлеткаў на свята для таго, каб паказаць ім, што наша гісторыя цікавая і самабытная, што нашы продкі ўмелі абараняць сваю сям'і і зямлю ад шматлікіх ворагаў — татараў, шведаў, асманаў. І гэтую памяць і спадчыну, якая нам засталася, мы павінны ведаць і шанаваць», — лічыць Ала Казловіч з Брэсцкай вобласці.

Цікавасць у прысутных выклікаў рамесніцкі кірмаш «Горад майстроў». Тут можна было не толькі ўбачыць унікальныя работы народных умельцаў — ганчароў, кавалёў, сыравараў, керамістаў, але і самастойна пад кіраўніцтвам вопытных прафесіяналаў паўдзельнічаць у працэсе вырабу арыгінальных рэчаў. Гаспадынь асабліва цікавілі рэцэпты розных страў. Вопытныя кухары ахвотна дзяліліся з імі працэсам вырабу сыроў, выпякання хлеба ў хатніх умовах. Дарэчы, захапляльнай і карыснай была выстаўка «Хлеб — жыцця аснова». Пекары хлебазаводаў Мінскай вобласці знаёмілі ўдзельнікаў з рознымі рэцэптурамі выпякання галоўнага прадукта на нашым стале. Паспытаць на фестывалі можна было і знакаміты жораўскі хлеб, выпечаны па старадаўніх рэцэптах, якія аднавілі ў Доме народных традыцый у вёсцы Жораўка і Кузьмічы Любанскага раёна. Гэты хлеб унесены ў Спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны. Загадчыца Жораўскага дома народных традыцый Ірына Жудрык выпякае хлеб па сямейных рэцэптах, якія перадаваліся з пакалення ў пакаленне. Ірына Міхайлаўна выкарыстоўвае толькі тое, што вырашчана ў сваёй гаспадарцы, на агародзе. Купляе толькі соль і муку, астатнія інгрэдыенты — кіслае малако, яйкі, кмен — і ніякіх штучных прымесяў. Бохан атрымліваецца духмяны, доўга не чарсцвее. Удзельнікі не толькі слухалі вопытнага майстра, але і частаваліся смачным хлебам.

— Я планую заняцца вырабам мыла. І мне вельмі цікавыя тэхналогіі мылаварэння нашых продкаў, — кажа адна з удзельніц мерапрыемства Аліна. — Якія інгрэдыенты яны дабаўлялі, як фармавалі, сушылі брускі. Спадзяюся, што майстар-класы, якія даюць рамеснікі, дапамогуць мне набрацца ведаў і разабрацца з тонкасцямі і нюансамі.

А падсілкавацца ўдзельнікі фестывалю маглі ў стылізаваных харчэўнях, дзе ім падавалі стравы, прыгатаваныя як па старажытных рэцэптах, так і па сучасных, напрыклад, шашлык на вуголлях, квас з рознымі пахучымі травамі і зёлкамі.

Дзецям і падлеткам былі цікавыя работы юных мастакоў-удзельнікаў конкурсу-пленэру «Фарбы роднай зямлі», дзе тыя малявалі старажытныя замкі, гістарычныя часткі гарадоў.

На сцэнічнай пляцоўцы Англійскага парку з канцэртнымі праграмамі выступілі аматарскія творчыя калектывы, а таксама гурты Hard Wood, «Яварына», «Хмельны Вір», Nevrida, Yann Zhanchak, Sakramant, арт-гурт «Беларусы».

Кульмінацыяй фестывалю стала чароўнае і ўрачыстае дзейства — «Баль у Радзівілаў» у суправаджэнні калектываў «Яварына», «Пастараль», капэлы «Санорус». Удзельнікі балю прадстаўлялі найбольш заможныя роды Беларусі. Вяльможныя паны танцавалі паланэз, астэндэз, бранль, падэграс, бірэ. Ну а гасцей віталі гаспадары палаца Міхаіл Казімір Радзівіл па мянушцы Рыбанька і Францішка Урсула (Уршуля). Завяршыла фестываль шоу «Вогненнае кола».

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

На зямлі і на балоце

# «Ідуць касцы, звіняць іх косы»

## Аграэкафестываль «Спораўскія сенакосы» прайшоў у Бярозаўскім раёне ў 14-ы раз

**Цяпер і ў сельскай мясцовасці чалавек з касой — вялікая рэдкасць. А каб косы сапраўды звінелі, кладучы траву ў роўны пракос, як напісана ў класіка, — гэта ўжо зусім экзотыка.Такое хіба ў старых фільмах убачыш. Цяпер траву косіць тэхніка, а на прыватных сядзібах гудуць-трашчаць трымеры. Дык вось, фестываль «Спораўскія сенакосы» дае хоць раз на год магчымасць убачыць сапраўдную дзедаўскую касьбу.**

Паўтара дзясятка гадоў таму фестываль быў задуманы як спроба прыцягнуць увагу да праблемы захавання балот, абышоў выратаваных адкрытых адной з галоўных крыніц кісларoду. Раней балоты пачувалі сябе добра, бо людзі іх штогод абкошвалі. А як пакінулі гэтую справу, балоты пачалі зарастаць, хварэць, сталі знікаць іх традыцыйныя насельнікі — птушкі і жывёліны. Вунь і маленькая вяртлявая чаротаўка, паводле сцвярджэння спецыялістаў, на мяжы знікнення. Пра гэта на фестывалі зноў нагадаў **дырэктар рэспубліканскага біялагічнага заказніка «Спораўскі» Вадзім ПРАТАСЕВІЧ.** На тэрыторыі заказніка побач з вёскай Высокае ў чатырнаццаты раз прайшоў фэст і чэмпіянат па ручным абкошванні балота.

Да гэтага спаборніцтва яго ўдзельнікі рыхтаваліся цэлы год. Выбраць найлепшых суддзям аказалася не так і проста. Дваццаць камандаў-удзельнікаў у выніку лёсавання атрымалі пракос, які складаў 100 метраў у даўжыню і паўтара метра ў шырыню. Вышыня пакосу павінна была скласці не больш за 7,5 сантыметра. Ацэньвалася хуткасць. Пры любых парушэннях налічваліся штрафныя секунды. Правілы вядомыя, шмат разоў апрабаваныя. Касцы іх ведалі і не падвялі.

У камандным спаборніцтве перамогу атрымалі Аляксандр Іваноў і Валерый Гайко з заказніка «Выганашчанскае». Георгій Равенька і Іван Равенька з ААТ «Спорава» занялі другое месца. Трэцімі сталі «Какорыцкія асілкі» — браты Аляксандр і Андрэй Шыкулы. У асабістым першынстве перамогу заваяваў Віктар Зданові ч.



**Старшыня Брэсцкага аблвыканкама Юрый ШУЛЕЙКА таксама з задавальненнем прымаў удзел у свяце.**

Быў, вядома, і любімы гледачамі футбол на балоце. Усе дзесяць камандаў удзельнікаў былі адзначаны граматамі і каштоўнымі прызамі. Арганізатары зрабілі ўсё, каб удзельнікі і госці фестывалю пабывалі на свяце і засталіся задаволеныя. Тут разгарнулі разнастайныя гандлёвыя палаткі, праходзілі выстаўкі, гучалі песні і музыка. Ахвотныя маглі паўдзельнічаць, напрыклад, у рабоце станцыі кальцавання птушак, і нават палятаць на дэльтаплане.

А ўжо што нaконт касьбы — тут можна было і палюбавацца, і павучыцца. На пакосы выйшлі нават жаночыя дуэты, а таксама асобныя дзяўчаты ды жанчыны. Адзін з такіх дуэтаў, дарэчы, удзельнічаў у спаборніцтве. І хай сабе пакуль жанчыны не ўзялі прызавых месцаў, але заахвочвальныя прызы і падарункі яны атрымалі.

Гэтым разам узяліся за косы і ганаровыя госці аграэкафестывалю. У іх ліку **старшыня Брэсцкага аблвыканкама Юрый ШУЛЕЙКА.** Губернатар прайшоў добры пракос разам з удзельнікамі, а затым падзяліўся ўражаннямі, якія назваў пазітывам ад спрадвечнай вясковай работы. А яшчэ расказаў, што паходзіць з сялянскай сям'і, што касіць у старэйшых класах яго навучыў бацька. Кіраўнік вобласці яшчэ раз нагадаў прысутным пра галоўную задачу фестывалю, яго асветніцкі напрамак. Паводле яго слоў, фестываль патрэбны для таго, каб захоўваць нізінныя балоты з іх разнастайнай экасістэмай, а яшчэ каб нагадваць цяперашняму пакаленню, якая нялёгкая заўсёды была сялянская праца, каб людзей, што працуюць на зямлі, усе астатнія паважалі і цанілі.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# ПРАСТОРА ДАБРЫНІ

**Дзевяць дзён таму пайшла з жыцця вядомая беларуская пісьменніца Алена Сямёнаўна ВАСІЛЕВІЧ, якая нарадзілася на Случчыне 22 снежня 1922 года. Пайшла з жыцця на 99-м годзе...**



Скончыўшы ў 1946 годзе філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта, Алена Васілевіч працавала ў Курскім абласным выдавецтве. У 1950 — 1972 — супрацоўніца часопіса «Работніца і сялянка». Затым — загадчыца рэдакцыі літаратуры для юнацтва выдавецтва «Мастацкая літаратура». Працавала Алена Сямёнаўна і ў выдавецтве «Юнацтва».

Пакаленні падлеткаў былі захопленыя яе кнігамі. Найперш — тэатралогіяй «Пачакай, затрымайся...» Гэты цыкл склалі аповесці «Расці, Ганька», «Доля знойдзе цябе», «Новы свет», «Пачакай, затрымайся...» За гэтыя творы, напісаныя на аўтабіяграфічным матэрыяле (на восьмым годзе жыцця Алена Васілевіч засталася без бацькоў, гадавалася ў сваякоў), пісьменніца адзначана Дзяржаўнай прэміяй БССР імя Якуба Коласа (у 1976 годзе).

З-пад пяра Алены Васілевіч выйшлі кнігі «Блізкія знаёмыя», «Заўтра ў школу», «Сябры», «Падслухала сэрца», «Калінавая рукавічка», «Я з намі», «Пісар стравой часці», «Адно імгненне», «Шурка Рэмзікаў», «Мыс Добрай Надзеі», «Элегія»... Апошнія дзесяцігоддзі пісьменніца не выступала ў друку з арыгінальнымі творамі. Гаварыла ў рэдкіх інтэрв'ю пра тое, што яе час ужо мінуў, прыйшлі новыя чытачы. І ўсё ж перавыдаваліся ранейшыя кнігі, апавяданні, аповесці Алены Васілевіч уваходзілі ў калектыўныя зборнікі, хрэстаматы. Настаўнікі беларускай літаратуры і сёння раяць іх чытаць сваім вучням, хлопчыкам і дзяўчынкам, якія адкрываюць жыццё... Прычына відавочная — у прозе, вытокі якой у іншым часе, прысутнічаюць светласць і дабрыня, без якіх не абысціся і сёння.

У пачатку 1980-х гадоў быў выдадзены трохтомнік Выбраных твораў Алены Васілевіч. Шкада, што няма пакуль асобнай манаграфіі пра творчасць пісьменніцы, аповесці і апавяданні якой яшчэ доўга будуць хваляваць чытача.

**Мікола МІРШЧЫНА.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5, корп. 2, пом. 1703** |
| **Продавец** | **ЗАО «Белтехнология и М», г. Минск, пр. Пушкина, д. 70 Тел. +375 29 6139869** |

**Предмет аукциона, назначенного на 20.09.2021**

**Лот № 1**

| Наименование | Общ. пл. | Инв. номер | Адрес |
|---|---|---|---|
| **Производственно-складское помещение** | 893,9 кв. м | 500/D-798186687 | **г. Минск, ул. Притыцкого, 62/12-2** |
| **Складское помещение** | 1127,4 кв. м | 500/D-798186686 | **г. Минск, ул. Притыцкого, 62/12-1** |

***В состав лота входит оборудование***: перечень см. на сайте организатора аукциона (ipmtorgi.by)

**Начальная цена лота № 1 (с НДС 20 %) – 1 003 336,00 дол. США**
Шаг аукциона – 50 166,80 дол. США

**Лот № 2**

| | |
|---|---|
| **Ограждение бетонное** (инв. номер 980773) | **г. Минск, ул. Притыцкого, 62/12** |

**Начальная цена лота № 2 (с НДС 20 %) – 6 120,00 дол. США**
Шаг аукциона – 306,00 дол. США

***Сведения о земельном участке по лотам № 1 и № 2:*** пл. **0,8393 га,** предоставлен продавцу на праве общего долевого постоян. пользования (доля: 9/20) для обслуживания здания специализир. складов, торг. баз, баз матер.-технич. снабжения, хранилищ. ***Ограничения (обременения) прав:*** охранные зоны линий связи и радиофикации (пл. 0,0883 га), электрич. сетей (пл. 0,1015 га), сетей и сооружений водоснабжения (пл. 0,4060 га) и канализации (пл. 0,0580 га)

**Лот № 3**

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Административное, производственное** | 2007,2 кв. м | 500/С-21619 | **г. Минск, пр-т Пушкина, 70** |

***В состав лота входит оборудование***: перечень см. на сайте организатора аукциона (ipmtorgi.by)

**Начальная цена лота № 3 (с НДС 20 %) – 1 287 211,20 дол. США**
Шаг аукциона – 64 360,56 дол. США

**Лот № 4**

| | |
|---|---|
| **Домик-сторожка** (инв. № 2) | **г. Минск, пр-т Пушкина, 70** |
| **Ограждение из металлич. сетки** (инв. № 4) | |
| **Ворота самонесущие с электромехан. приводом и калиткой** (инв. № 5) | |
| **Теплотрасса** (инв. номер 30121 | |

**Начальная цена лота № 4 (с НДС 20 %) – 6 012 дол. США**
Шаг аукциона – 300,60 дол. США

***Сведения о земельном участке по лотам № 3 и № 4:*** пл. **0,3600 га,** предоставлен продавцу на праве постоян. пользования. Целевое назначение: реконструкция здания кассет. цеха с размещением администрат. помещений и механосбороч. производства. ***Ограничения (обременения) прав:*** охранные зоны технич. водопровода (пл. 0,0883 га), газофикации сред. давления (пл. 0,0414 га)

**Лоты №№ 5–18 – оборудование и транспортное средство, бывшие в употреблении**
Месторасположения: г. Минск, пр-т Пушкина, д. 70

| Лот № | Наименование | Инв. № | Начальная цена* (с НДС 20 %), дол. США | Шаг аукциона, дол. США |
|---|---|---|---|---|
| 5 | Аппарат гидроабразивной резки | 70103 | 68 160,00 | 3 408,00 |
| 6 | Аппарат плазмен. резки CUT120 IGBT | 70074 | 528,00 | 26,40 |
| 7 | Вертикальный обрабат. центр с ЧПУ ECO CENTER 350 CNC с системой управления GPPlus 450 | 70089 | 25 200,00 | 1 260,00 |
| 8 | Обрабат. центр(Si) Vector1500 CNC*CNC | 41031 | 58 920,00 | 2 946,00 |
| 9 | Полуав-т для пайки дорож. резцов модели АПЗ-124 | 70124 | 66 960,00 | 3 348,00 |
| 10 | Полуавтомат для пайки дорож. резцов модели АПЗ-4 | 41028 | 43 680,00 | 2 184,00 |
| 11 | Станок радиально-сверлильный 2К522 | 41022 | 3 960,00 | 198,00 |
| 12 | Станок специ. ленточно-отрез. МП6-1570 | 41007 | 1 920,00 | 96,00 |
| 13 | Техн. линия по производ. путев. шуруп. на базе стана попереч.-клин. с инд. нагрев. SPL2500-2-IH-133 | 70179 | 928 800,00 | 46 440,00 |
| 14 | Токар. станок с индикатором положения Turnado 280/1500 | 41033 | 5 400,00 | 270,00 |
| 15 | Токарный станок с ЧПУ Fanuc Oi-Mate с накладной станиной Compact 330 | 41034 | 32 640,00 | 1 632,00 |
| 16 | Широкоунивер. фрезерный станок с УЦИ ZX 635OC | 41025 | 5 644,00 | 282,20 |
| 17 | Автомобиль MAZ 437 143 329-00 (рег. знак АР 0818-7) | - | 11 640,00 | 582,00 |
| 18 | Станок Hedelius -CB 80 Magnum | 70147 | 91 200,00 | 4 560,00 |

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона по лотам №№ 1–18** | **20.09.2021 в 13.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка» |
| **Дата, время начала и окончания приема заявлений по лотам №№ 1–18** | **С 09.00 17.08.2021 до 17.00 17.09.2021** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка» |

**Предмет повторного аукциона, назначенного на 20.09.2021**

**Лоты №№ 19–21 – оборудование, бывшее в употреблении**
Месторасположения: г. Минск, пр-т Пушкина, д. 70

| Лот № | Наименование | Инв. № | Начальная цена* (с НДС 20 %), дол. США | Шаг аукциона, дол. США |
|---|---|---|---|---|
| 19 | Станок плоскошлиф. ОШ424Ф11 с УЦИ | 41021 | 8 294,00 | 414,70 |
| 20 | Станок консольно-фрезерный ВМ127М | 41019 | 9 786,80 | 489,34 |
| 21 | Станок отрезной ДОС | 41012 | 324,00 | 16,20 |

Цена снижена по лоту № 20 на 14 % и по лоту № 21 на 32 %

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона по лотам №№ 19–21** | **30.08.2021 в 13.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка» |
| **Дата, время начала и окончания приема заявлений по лотам №№ 19–21** | **С 09.00 17.08.2021 до 17.00 27.08.2021** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка» |

**Демонтаж, разборка, погрузка и транспортировка предмета аукциона** проводится за счет покупателя. Продавец и организатор аукциона не оказывают услуг по демонтажу и вывозу предмета аукциона

*Примечание: цена продажи Предмета аукциона фиксируется в протоколе о результатах аукциона в сумме в белорусских рублях, эквивалентной цене продажи лота в долларах США по курсу НБРБ на дату проведения аукциона)

**Порядок ознакомления:** в рабочие дня по предварительному согласованию +375 (29) 6139869, Дмитрий

**Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов:** аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридич. лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совмина РБ от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, в том числе документ, подтверждающий внесение задатка с отметкой банка, в размере 10 % от начальной цены предмета аукциона, зарегистрированные в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения аукциона.
С подробной информацией о перечне предоставляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона **ipmtorgi.by**

В случае регистрации или явки на аукцион одного участника, предмет аукциона может быть продан данному участнику при его согласии по начальной цене увеличенной на 5 %

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; УНП 191224638; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка»

**Срок заключения договора купли-продажи – 10 (десять) дней** после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета аукциона:** предмет аукциона должен быть оплачен покупателем в течение **20 (двадцати) календарных дней** со дня проведения аукциона

Победитель аукциона либо единственный участник, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на организацию и проведение аукциона, а также оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере 3 (трех) процентов от цены продажи лота в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона

Извещение о проведении предыдущего аукциона опубликовано в газете «Звязда» 22.05.2021

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

**Контактные телефоны: +375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06.**
**E-mail: auction@ipmconsult.by**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

**Организатор электронных торгов:** Михановичский сельский исполнительный комитет, 223070, Минская область, Минский район, Михановичский сельсовет, аг. Михановичи, пер. Садовый, 8, тел.: 8 (017) 545-10-25, 503-71-00.
**Оператор электронной торговой площадки:** ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа», +375(1) 3093249, +375 (29) 1987819.
**Торги проводятся 03.09.2021** на электронной торговой площадке «БУТБ-Имущество», **www.et.butb.by.**
**Время торгов** устанавливается инструментарием площадки в автоматическом режиме

| № лота | Местонахождение земельного участка; кадастровый номер | Площадь земельного участка, га | Инженерная инфраструктура | Начальная цена лота, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. | Сумма затрат на организацию и проведение торгов, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Минская обл., Минский р-н, Михановичский с/с, аг. Чуриловичи, У-1; 623684206601000392 | 0,1470 | Электроснабжение – имеется проект | 31 000,00 | 3 100,00 | 1 848,00 +ЭТП + СМИ |
| 2 | Минская обл., Минский р-н, Михановичский с/с, аг.Чуриловичи, У-5; 623684206601000366 | 0,1347 | Электроснабжение – имеется проект | 28 500,00 | 2 850,00 | 1 848,00 +ЭТП + СМИ |

**Окончание приема заявлений на участие в торгах с прилагаемыми к ним документами** – 30.08.2021, до 15.00.

**Задаток** для участия в торгах перечисляется на текущий (расчетный) банковский счет № BY60AKBB30120000066940000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код AKBBBY2X, УНП 190542056, получатель платежа – ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа».

**Срок внесения задатка** – не позднее даты и времени окончания приема заявлений на участие в торгах.

**Назначение платежа**: внесение суммы задатка для участия в электронных торгах рег. № ___ по заявлению № ___.
Подробная информация на сайтах
**www.gki.gov.by и www.et.butb.by.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА
## ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНА – ЧЕРВЕНСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

| № лота | Сведения о виде и предмете аукциона | Адрес объекта и его наименование | Сроки аренды | Начальная цена объекта (рублей) | Сумма задатка (рублей) | Расходы по организации и проведению аукциона (рублей) | Ограничения (обременения) прав в использовании земель и другие ограничения |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Аукцион по продаже земельного участка в частную собственность гражданам Республики Беларусь | Земельный участок для ведения коллективного садоводства, расположенный по адресу: Минская область, Червенский район, Смиловичский с/с, садоводческое товарищество «Купава-94», номер участка 74, площадь 0,1146 га, кадастровый номер 625883500001001255 | | 5 638,32 | 563,83 | 1 380,5 + расходы по размещению извещения в СМИ | Ограничения (обременения прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, площадь – 0,0012 га |

***Задаток перечисляется на расчетный счет BY94 AKBB36410 62700002600 0000 в ЦБУ 627 филиала № 500 МУ ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 600008398.***

Оплата за объект аукциона (включая затраты, связанные с его проведением) должна быть осуществлена в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона. Для участия в аукционе представляются: заявление, документ, подтверждающий внесение суммы задатка, с отметкой банка, а также иные документы, предусмотренные Положениями о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков и продажи земельных участков в частную собственность, утвержденными постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462.

При подаче заявления заключается соглашение с райисполкомом о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Аукцион проводится при наличии не менее двух участников.

**Аукцион состоится 17 сентября 2021 года в 11.00 в здании Червенского райисполкома (зал заседаний) по адресу: г. Червень, пл. Свободы, 1.**

Заявления на участие и необходимые документы принимаются с момента опубликования извещения в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Червень, пл. Свободы, 1, райисполком, кабинет 71, тел. 80171428486 по 16 сентября 2021 года включительно.

## ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY**.

Продавец: **КСУП «Вензовец»** (УНП 500056209), 231488, аг. Вензовец, ул. Новая, 1в, Дятловского р-на Гродненской обл., тел./факс: +375 1563 67-1-21, 67-1-41, в лице антикризисного управляющего частного предприятия «Правовой путь».

Повторные публичные торги в форме аукциона в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) будут проведены **02 сентября 2021 г. 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28.

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена, бел. руб. без НДС |
|---|---|---|
| 1 | Реконструкция молочнотоварной фермы, Гродненская обл., Дятловский р-н, д. Явор | 57 271,01 |
| 2 | Забор железобетонный (ул. В. Битько), забор железобетонный (ул. Новая), забор железобетонный (аг. Вензовец), асфальтированная дорожка к клубу (аг. Вензовец), туалет | 3 540,00 |

Тел. для ознакомления и осмотра +37529 698-53-53.

**Для участия в торгах необходимо в срок** с 18.08.2021 г. 09.00 по 01.09.2021 г. 17.00:

1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте **BELTORGI.BY.**

2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за пять дней до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан оплатить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, и аукционный сбор в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Срок заключения договора купли-продажи: не позднее 14 календарных дней со дня проведения торгов.

Срок оплаты предмета торгов: не позднее 30 календарных дней со дня проведения торгов. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано а газете «Звязда» от 13.07.2021 г.

## ОАО «Нафтан» реализует на конкурсной основе (с повышением начальной цены) бывшее в употреблении неиспользуемое имущество:

| Наименование | Инв. № | Год ввода в эксплуатацию | Начальная цена без НДС, руб. РБ | Начальная ценас НДС, руб. РБ |
|---|---|---|---|---|
| **Бульдозер ДТ-75** | 04150110 | 1998 | 3156,00 | 3787,20 |

Состояние удовлетворительное.

Предложения принимаются по адресу: 211441, г. Новополоцк-1, ОАО «Нафтан», заводоуправление, каб. 101, до 9.30 по местному времени 16 сентября 2021 года с пометкой на конверте «Реализация неликвидов, Нафтан, 16.09.2021» либо в электронной форме на e-mail: tender.box@naftan.by с вышеуказанной пометкой.

Извещение на проведение конкурса размещено на сайте **www.naftan.by.**

Контактные телефоны:
**8 (0214) 59-89-26, 8 (0214) 59-88-42.**

УНП 600077154

## ООО «Вельми Смачна»

информирует покупателей (потребителей)
ОБ ОРГАНИЗАЦИИ ВОЗВРАТА

- **печенья затяжного Grona «Грона Сластена со вкусом топленого молока»,**
- **печенья затяжного Grona «Грона к посту»,**
- **крекера Grona «Грона крекер Морской круиз».**

Изготовитель: ООО фирма «Грона», Украина, Киевская обл., г. Сквира.

Возврат можно осуществить в месте приобретения продукции или по адресу: ООО «Вельми Смачна», г. Минск, Логойский тр-т, д. 37, пом. 7, оф. 19.

УНП 192955293

# ДАВЕДАЦЦА ПРА ЧУЖЫЯ ДАЎГІ МОЖНА Ў ІНТЭРНЭЦЕ

## У Беларусі працуе банк даных выканаўчых вядзенняў

**Электронны рэсурс дазваляе атрымаць больш поўную інфармацыю па дакументах, згодна з якімі з неплацельшчыка прымусова спаганяецца доўг. Спосаб атрымання інфармацыі і яе паўната адрозніваюцца ў залежнасці ад таго, хто хоча яе даведацца. А асоба ці арганізацыя, якой дадзены гэтыя звесткі, павінна забяспечыць іх абарону ад незаконнага выкарыстання. Як гэта робіцца, колькі каштуе і хто мае на гэта права, растлумачылі ў Міністэрстве юстыцыі.**



### ШТО ГЭТА ЗА РЭСУРС?

Банк даных выканаўчых вядзенняў (БДВВ) быў створаны, каб удасканаліць парадак уліку, апрацоўкі, назапашвання, захоўвання і давання звестак аб такіх дакументах. Новы рэсурс ні ў якім разе не падмяняе сабой Рэестр запазычанасцяў па выканаўчых дакументах, які ўжо функцыянуе на інтэрнэт-партале Мінюста, запэўнілі ў ведамстве. Рэестр працягне сваю работу, і атрымаць інфармацыю па даўжніках там можна будзе, як і раней, калі ўвесці адпаведныя звесткі з прозвішчам і ідэнтыфікацыйным нумарам або найменнем і ўліковым нумарам плацельшчыка ў адпаведныя палі на вэб-старонцы.

— Банк даных фарміруецца і вядзецца ў электронным выглядзе праз загрузку звестак аб выканаўчых вядзеннях з інфармацыйных рэсурсаў органаў прымусовага выканання. Даныя абнаўляюцца не пазней як за адзін рабочы дзень, які ідзе за датай унясення ці змянення адпаведных звестак у інфармацыйных рэсурсах, — заўважыла **Вольга ШЫБКО, прэс-сакратар Міністэрства юстыцыі.**



pravo.by

### ІП, СУДЫ І ІНШЫЯ

Тых, хто мае права на атрыманне інфармацыі па даўгах з банка, можна падзяліць на тры катэгорыі:

грамадзяне, індывідуальныя прадпрымальнікі (ІП), юрыдычныя асобы, якія з'яўляюцца бакамі выканаўчага вядзення;

натарыусы, суды і іншыя дзяржорганы;

«іншыя заяўнікі» — усе астатнія асобы, якія хочуць атрымаць звесткі па выканаўчым вядзенні.

Найбольш падрабязныя звесткі маюць права атрымаць натарыусы, суды і дзяржорганы. Ім даюцца звесткі пра даўжніка і спагнанніка доўгу (пры наяўнасці ў іх прадугледжанага заканадаўчымі актамі права на атрыманне персанальных даных); нумар выканаўчага вядзення і дата яго пачатку; найменне, дата і нумар выканаўчага дакумента; орган, які выдаў выканаўчы дакумент, і змест патрабаванняў па ім; сума запазычанасці; колькасць грошай, якую ўжо спагналі ў межах выканаўчага вядзення, і рэшта доўгу; назва органа выканаўчага вядзення, у якім знаходзілася ці знаходзіцца выканаўчае вядзенне; пералік дзеянняў, якія прымяняліся для здзяйснення выканаўчага вядзення (спагнання доўгу); вынік выканання (з указаннем падстаў для спынення выканаўчага вядзення, вяртання выканаўчага дакумента спагнанніку); дата завяршэння выканаўчага вядзення.

Бакі выканаўчага вядзення (грамадзяне, ІП, юрыдычныя асобы) маюць права атрымаць амаль такую ж інфармацыю, як і дзяржорганы, за выключэннем звестак пра даўжніка і спагнанніка доўгу.

Усе астатнія, хто зацікаўлены ў звестках пра даўжніка, могуць атрымаць інфармацыю пра нумар і дату пачатку выканаўчага вядзення; змест патрабаванняў выканаўчага дакумента; суму запазычанасці па выканаўчым вядзенні, колькасць спагнаных у яго межах грошай і рэшту доўгу; вынік выканання (з указаннем падстаў для спынення выканаўчага вядзення, вяртання выканаўчага дакумента спагнанніку); дату завяршэння выканаўчага вядзення.

### ПА QR-КОДЗЕ І ПРАЗ АРІП

Атрыманне звестак з банка выканаўчых вядзенняў платнае, аднак ёсць некаторыя выключэнні.

— Без грошай даведацца пра выканаўчыя вядзенні, распачатыя ў адносінах да даўжніка, могуць натарыусы, суды і іншыя дзяржаўныя органы, а таксама бюджэтныя арганізацыі. Фактычна гэта тыя органы, якім інфармацыя патрэбна ў межах іх работы. Бясплатна могуць даць звесткі і бакам выканаўчага вядзення — грамадзянам, аднак не часцей, чым раз на месяц, — акцэнтавала ўвагу прэс-сакратар міністэрства. — Калі чалавек звяртаецца па інфармацыю другі раз на месяц у дачыненні да аднаго і таго ж даўжніка, за яе прыйдзецца заплаціць. Дзяржаўная пошліна складае тры базавыя велічыні (87 рублёў) за кожнага даўжніка.

Заплаціць дзяржпошліну можна з дапамогай QR-коду ці праз банкаўскую сістэму. Каб атрымаць QR-код, трэба сфарміраваць запыт на адзіным партале электронных паслуг. Іншы шлях — звярнуцца з пісьмовай (ці ў форме электроннага дакумента) заявай у органы прымусовага выканання, якія сфарміруюць рэквізіты для аплаты: QR-код і ўнікальны нумар для аплаты. Плаціць трэба менавіта па гэтых рэквізітах — тады звесткі аб пераводзе дзяржпошліны будуць адразу перададзены ў банк даных выканаўчых вядзенняў, і не спатрэбіцца пацвярджаць дадзеную аперацыю. Такі спосаб аплаты найбольш пажаданы, удакладнілі ў Мінюсце.

Аднак можна аплаціць дзяржпошліну і без гэтых рэквізітаў, скарыстаўшыся сістэмай АРІП ці праз банк. Такі спосаб будзе дапушчальны пры падрыхтоўцы запыту аб даванні звестак аб выканаўчых вядзеннях у пісьмовай форме ці ў форме электроннага дакумента.

### ПРАВА НА АТРЫМАННЕ ІНФАРМАЦЫІ

Каб замовіць звесткі пра даўжніка, трэба пазначыць найменне органа, у які падаецца заява, і звесткі пра сябе (заяўніка) і чалавека ці юрыдычную асобу, пра даўгі якіх неабходна даведацца. Пры гэтым трэба ўказаць усю інфармацыю, якая дазволіць ідэнтыфікаваць даўжніка, а таксама прадставіць пералік запрошаных аб выканаўчым вядзенні звестак.

Пра заяўніка і даўжніка неабходна ўказаць пэўную інфармацыю ў залежнасці ад статусу асобы: грамадзяніна, індывідуальнага прадпрымальніка ці юрыдычнай асобы. Да заявы неабходна абавязкова прыкласці дакументы, якія пацвярджаюць яго паўнамоцтвы, удакладніла Вольга Шыбко:

— Жадаючым атрымаць звесткі пра даўгі грамадзяніна ці юрыдычнай асобы трэба абазначыць яго прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку і ідэнтыфікацыйны нумар (калі яго няма, то ўказаць звесткі дакумента, які сведчыць асобу): нумар, дату выдачы, найменне органа, які выдаў дакумент. Таксама неабходна ўказаць месца жыхарства (знаходжання) і нараджэння грамадзяніна. Калі запыт рыхтуецца адносна індывідуальнага прадпрымальніка, акрамя ўжо абазначанай інфармацыі, трэба дадаць яшчэ ўліковы нумар плацельшчыка ці іншы аналагічны нумар, які быў прысвоены ў замежнай дзяржаве. Каб высветліць, ці мае даўгі юрыдычная асоба, трэба ўказаць найменне, месца знаходжання, уліковы нумар плацельшчыка ці іншы аналагічны нумар, які быў прысвоены ў замежнай дзяржаве.

Калі звесткі атрымліваюцца платна, да заявы (пісьмовай ці электроннай) абавязкова неабходна прыкласці дакумент, які пацвярджае аплату дзяржпошліны.

### НА ПАПЕРЫ, ФЛЭШЦЫ І Ў ЭЛЕКТРОННЫМ ВЫГЛЯДЗЕ

Набыць звесткі з банка даных выканаўчых вядзенняў можна некалькімі спосабамі. Органам, якія ажыццяўляюць аператыўна-пошукавую дзейнасць (міліцыя, пагранічнікі, мытнікі), інфармацыя прадастаўляцца на электронным носьбіце не кропкава па пэўных выпадках, а па ўсіх існуючых у банку вядзеннях.

«Аператыўнікі», суды і падатковыя органы могуць атрымліваць звесткі і непасрэдна праз выдзелены канал перадачы даных. Для гэтага арганізуецца аддалены доступ да БДВВ у аўтаматызаваным рэжыме з дапамогай электроннага лічбавага подпісу. Такая магчымасць даецца ім да 1 студзеня 2023 года.

Натарыусы, суды і іншыя дзяржорганы могуць атрымліваць звесткі таксама пісьмова ці па электроннай пошце (да 1 студзеня 2023 года).

Звесткі праз агульнадзяржаўную аўтаматызаваную інфармацыйную сістэму (ААІС) можна атрымаць з выкарыстаннем адзінага партала электронных паслуг www.portal.gov.by; праз аддалены доступ у аўтаматызаваным рэжыме без выкарыстання адзінага партала электронных паслуг (трэба заключыць трохбаковае пагадненне паміж Мінюстам, Нацыянальным цэнтрам электронных паслуг і заяўнікам).

Грамадзяне, індывідуальныя прадпрымальнікі і юрыдычныя асобы могуць атрымаць звесткі пра пэўнае выканаўчае вядзенне пасля пісьмовай і электроннай заявы. Адказ яны атрымаюць ад органаў прымусовага выканання таксама пісьмова або ў форме электроннага дакумента.

### АБАРОНА ЗВЕСТАК

Важна памятаць, што ўсе, хто хоча атрымаць інфармацыю аб выканаўчых вядзеннях з адпаведнага банка, нясуць адказнасць за законнасць выкарыстання персанальных даных даўжніка, якія неабходна прадаставіць, каб набыць звесткі пра яго, нагадалі ў Мінюсце.

А карыстальнікі звестак па выканаўчых вядзеннях (тыя, хто дае інфармацыю, і асобы, якім яе перадаюць) абавязаныя вытрымліваць патрабаванні заканадаўчых актаў, што прад'яўляюцца да парадку збору персанальных даных. Грамадзяне, якія атрымалі звесткі па выканаўчых вядзеннях, павінны прымаць меры па захаванні гэтай інфармацыі і не дапускаць яе распаўсюджвання.

Ірына СІДАРОК.

# ВЯЛІКАЯ ЛІПА. МЕМУАРЫСТЫ І АХВЯРЫ ПАМФЛЕТА

**Люблю вандраваць па роднай Беларусі... Цяжка нават перадаць словамі гэтае хвалюючае пачуццё-прадчуванне, што вось-вось апынешся там, дзе раней не бываў, дзе не тоўпяцца турысты, слепячы ўспышкамі фотакамер мінулае, і адкрыюцца толькі табе скарбы гісторыі...**
**Мы наведваем старыя сядзібы і храмы, ад якіх часам засталіся толькі дзве аб'едзеныя ветрам сцяны, прабіраемся праз калючае кустоўе да падмуркаў, што калісьці належалі велічным палацам... Разбіраем амаль нечытэльныя надпісы на магільных камянях... Прыемна бачыць, як рэстаўруюць старыя будынкі, як натхнёна працуюць валанцёры. А часам глядзіш, як усё руйнуецца, зарастае пустазеллем — і хочацца крычаць... Гэта ж нашыя скарбы, гэта наша беларуская гісторыя, схаваная ў тым ліку ў тысячах руінаў!**
**І, вядома, гляджу я на тую спадчыну вачыма найперш пісьменніка: факты і даты — толькі фон... Бачацца вобразы, узнікаюць асацыяцыі, адшукваюцца сувязі з літаратурай... Давайце разам пройдземся гэтымі сцежкамі!**



## НЯЎДАЛЫ ВАЯВОДА

У Вялікую Ліпу, што ў Нясвіжскім раёне, мы прыехалі гарачым летнім днём...

«Лепей было, пане Філіпе, седзець табе ў Ліпе. Увалявся есть в велікую славу, як свіня у грась».

Так, згадка менавіта пра гэты маёнтак, у адным з найцікавейшых дакументаў XVII стагоддзя, «Лісце да Абуховіча» — цудоўным узоры беларускай палемічнай літаратуры. Галоўны ягоны герой, дакладней, антыгерой — уладальнік Вялікай Ліпы, ваявода Піліп Абуховіч, які 23 верасня 1654 года здаў Смаленск маскоўскім войскам. На сакавітай беларускай мове аўтар так адсцябаў няўдалага ваяводу, што і сёння чытаць смешна. Толькі на соймах прыгожа гаварыць умее, і дзед ягоны ў Мазыры «за малыя грошы няпраўду прадаваў», і бацька, суддзя Мазырскі, «у каго больш узяў — таго добра судзіў». А сам Піліп падаруначак ад ворага атрымаў у трыста вазоў.



Памфлет хадзіў па руках... Імя аўтара дакладна не высветлена, магчыма, гэта наваградскі шляхціц Іван Цыпрыян Камуняка.

Піліпа Абуховіча кароль апраўдаў — што ж, менавіта Піліп калісь кіраваў соймам, на якім Ян Казімір Ваза быў абвешчаны каралём, а двое ягоных сыноў служылі ў караля пакаёвымі. Але ганьба была нечуваная. Абуховіч, напэўна, на нейкі час і з'ехаў сюды, у Вялікую Ліпу, куды яго і пасылаў памфлетыст... Праз год захварэў і памёр, праўда, не тут, а на чале войска, пад Брэстам, у вайне супраць шведаў. Але так і ўяўляю ягоную прыгорбленую постаць у якім-небудзь акне маёнтка ці ў альтанцы, там, пад ліпамі... І крык прыслузе, каб гасцей не пускалі... Як пісана ў «Лісце да Абуховіча», «у людскіх абгаворах і сораме сядзіць, як дзяцел у дупле».

## БЕЛЫЯ РЫЦАРЫ

Мы падыходзім да выцягнутага пабеленага будынка з астраканцовай брамай... Гэтае дзіўнае збудаванне, адзінае на Беларусі, — стайня-брама. Яшчэ нядаўна ў магутных мурах трымалі коней. А вось і галоўная цікавостка, якую дужа любяць турысты: унутры брамы — уваходы ў аддзяленні стайні, а над уваходамі — барэльефы з вывявамі рыцараў. Латы, забрала, страусавыя пёры... Зусім як на гербе «Ясеньчык», якім карысталіся Абуховічы. Цуд, што захаваліся — бо ўсе «панскія ўпрыгожванні», фрэскі, ляпніну, скульптуру ў ХХ стагоддзі новыя, «калектыўныя», уладальнікі чамусь паўсюдна апантана знішчалі.

Наймалодшы член нашай каманды, чатырохгадовы Кастусёк, захоплена разглядае скульптуры і заяўляе, што будзе рыцарам.

Пасярэдзіне стайні брукаваная дарожка — так і ўяўляецца, як грукаюць па ёй капыты коней...

## РАДАВАЯ БІБЛІЯТЭКА

Сядзібны дом не захаваўся. Зірнулі на свіран — ён таксама ўпрыгожаны каменнымі гатычнымі аркамі... Як не ведаеш — дык не здагадаешся, што перад табой гаспадарчае збудаванне. Праз дах прасвечвае неба...

Дарэчы, назва паселішча паназначана яшчэ на той карце Вялікага Княства Літоўскага, што была выдадзена ў 1613 годзе ў Амстэрдаме, на сродкі Мікалая Радзівіла Сіроткі. Ён нейкі час быў уладальнікам Вялікай Ліпы, як і ўсіх навакольных земляў — у 1558 годзе ўзяў маёнтак і вёску ў залог у Мікалая Глябовіча, а потым і зусім «у падарунак» атрымаў. Так што яшчэ адзін цікавы цень сустракаем тут — аўтара «Перэгрынацыі, або Паломніцтва ў Святую Зямлю», дзе для ўражаных землякоў Сіротка апісваў не толькі звычаі чужаземшчыны, але хамелеона, кракадзіла, страуса, вярблюда, пальмы ды ерыхонскую ружу.

Але галоўнымі ўласнікамі сядзібы сталі ўсё-ткі Абуховічы — на чатыры стагоддзі. Менавіта яны ўсё тут і разбудавалі. Мясціны ж неверагодна прыгожыя — рака Сноўка, пагоркі, велічныя дрэвы... Пчол, кажуць, разводзілі, залаты ліпавы мёд бочкамі вазілі...

Кіруемся да афіцыны, двухпавярховага флігеля, дзе нядаўна месцілася школа. Відаць спробы рэстаўрацыі, наверх вядзе новая драўляная лесвіца. Уражвае скляпеністая столь — цагліны, укладзеныя шчыльна-шчыльна, утвараюць каменныя хвалі. Рэшткі камінаў... Вядома, печкі ў беларускім клімаце грэлі лепш, старасвецкая шляхта таксама так лічыла. Але як завезлі з Еўропы моду — так і пачалі шляхцюкі каміны ладзіць. Захавалася нават частка дэкору...

А вось незвычайны пакой... Частка яго адгароджана каменнымі аркамі. Дамашні тэатр? Пасля мы даведаемся, што тут гаспадары захоўвалі каштоўныя сямейныя архівы — кляйноды, прывілеі, рукапісы... Напэўна, у арках знаходзіліся цяжкія дзверы... Як ад скарбніцы.

Піліп Абуховіч, дарэчы, спрабаваў абяліць сябе, пакінуўшы мемуары. У якіх не забыўся расхваліць караля, Яна Казіміра Вазу, што яго так літасціўі — «Такой бўй Пан мудрасці, храбрасці, шчасця..., што ні войнамі, а ні пакоем мінулых і будучых вякоў цяжка знайсці, цяжка абяцаць падобнага»... Сын Піліпа Тэадор, прыгнечаны кепскай славай, працягнуў мемуарную справу бацькі. Пісаць яму было пра што. Служыў пакаёвым пры Яне Казіміры Вазе дванаццаць гадоў, трапіўшы на службу чатырнаццацігадовым падлеткам, потым разам з каралём, які адрокся ад трона, адправіўся ў выгнанне, у французскі Невер, на радзіму каралевы Марысенькі. Потым удзельнічаў у знакамітай бойцы пад Хоцінам з войскамі Гусейн-пашы, застаў і вайну са шведамі.. Успаміны пакінуў і другі сын Піліпа, Міхал Лявон — таму давялося пабываць у маскоўскім палоне, дзе запісаў цікавыя назіранні пра царскі двор — даравітым палоннікам дазвалялася прысутнічаць пры ўсялякіх цырымоніях. «Далей ішоў сам цар, якога вялі пад рукі двое маладых людзей з вядомых радоў. На ім была шапка, накшталт кароны, якую яны называюць шапкаю Манамаха, на грудзях бармы і на плячах багатае адзенне накшталт рызы... Трохі пасля, калі скончаныя былі спевы, на санях, запрэжаных чатырма коньмі, пакрытымі чырвоным сукном, везлі вялікую вярбу, на якую прасталюдцы кідалі навязаныя на вяровачкі яблыкі. Яблыкі гэтыя заставаліся на дрэве, і іх было накідана немалая колькасць. Потым пасадзілі на вярбу чатырох юнакоў, апранутых у царкоўныя срэбныя рызы, яны спявалі нейкія песні».

Ці не тут, у гэтым пакоі з аркамі, цяпер пустым, захоўваліся мемуары Абуховічаў?

## ІМЁНЫ НА ВОКЛАДКАХ І КАПЛІЦАХ

На цаглянай сцяне — надпіс усюдыісных «вулічных мастакоў»: «Твори или умри». Сімвалічна...

Трое згаданых Абуховічаў, Піліп і двое сыноў, пахаваныя ў Навагрудку... А за вёскай, на старых могілках, мы знайшлі паўзруйнаваную капліцу з надпісам на лаціне... Надпіс пагубляў металічныя літары, але можна здагадацца, што гэта цытата з Бібліі «Qui vivite in me non morietur» — «Тыя, хто жывуць ува мне, ніколі не памруць»... Чые астанкі там ляжалі — я пакуль не даведалася.

Дарэчы, Піліп Абуховіч, які ведаў некалькі моў і сапраўды вылучаўся красамоўствам, пісаў вершы на лаціне.

Род Абуховічаў застаўся ў нашай гісторыі. На першай кнізе па антрапалогіі, якая з'явілася на нашых землях, Юзафа Ясінскага, выдадзенай у Вільні ў 1818 годзе, ёсць прысвячэнне мецэнатам, Міхалу, Піліпу і Ксавeрыю Абуховічам. Гэта тры браты, а малады лекар Ясінскі служыў у іх бацькі, пана Юзафа. Мяне зацікавіла, чаму ж самога пана Юзафа Ясінскі не згадвае? Ды таму, што той стаў удзельнікам паўстання Касцюшкі, потым з'ехаў, і на той час імя ягонае цэнзура не прапусціла б.

Унук Юзафа, Альгерд Абуховіч, абраў сабе лёс беларускага пісьменніка. Ён дыскутаваў з Францішкам Багушэвічам наконт асаблівасцяў беларускай мовы, пісаў байкі, памёр у жабрацтве, маючы адзінае багацце — шафу з кнігамі. Рукапісы ягоныя былі знішчаныя.

...З'язджаем, развітаўшыся з белымі рыцарамі... Мінаем суседнюю вёску Высокая Ліпа — яна сапраўды на пагорку. Які ж будзе лёс сядзібы ў Вялікай Ліпе?

Так, яна ўсё больш прыцягвае турыстаў, знаходзіліся энтузіясты, якія ўзяліся за рэстаўрацыю... Толькі б не абвалілася, дачакалася сваёй новай славы.

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**
**Фота аўтара.**

Шануй сваё!

# НЯЗВЕДАНАЯ, ЗАГАДКАВАЯ, ТАЯМНІЧАЯ... ВУЗКАКАЛЕЙКА

## Як энтузіясты развіваюць праект, якога яшчэ не было ў Беларусі

**Аднойчы ехала па справах у Лунінец. Суседкай па вагоне аказалася гаваркая жанчына-паляшучка.**
**— Ведаеце, каб мае прабабулі ўбачылі гэты магутны цягнік, у іх бы сэрца ад страху разарвалася б. Мне дзед расказваў такую гісторыю. У нашы мясціны прыехалі людзі, нешта мералі, чаравалі, а затым пачалі пракладваць нейкія металічныя палкі. Гэта цяпер мы разумеем, што планавалі будаваць вузкакалейку. А палешукі сярод балот жылі закрыта ад цывілізацыі, у суседнюю вёску дабіраліся на лодцы або чакалі, пакуль балота марозам скуе. Ніколі не бачылі не тое што паравоза, а нават машыны. І вось ідуць жанчыны з лесу з поўнымі кошыкамі. І тут бачаць, нешта незразумелае пыхкае па рэйках. Дык яны кінулі свой скарб ды з крыкамі назад у лес паўцякалі...**
**Пра гісторыю развіцця вузкакалейкі ў Беларусі ведае ўсё ці амаль усё Арцём СЛІЗКІ. Арцём Міхайлавіч працуе ў арганізацыі «Мінскметрапраект», а свой вольны час прысвячае тэме вузкакалеек.**



— Першы вузкакалейны пуць з'явіўся ў Беларусі ў сярэдзіне XIX стагоддзя. Ён злучаў Старынкаўскі чыгуналіцейны завод і прыстань на рацэ Сож. Ваганеткі цягнулі ўручную, з дапамогай коней. Першая паравая дарога была пракладзена ў канцы XIX стагоддзя Баляславам Ялавецкім і злучала Свянцяны (літоўскі Швенчэніс) з Беразвечам (горад Глыбокае ў Віцебскай вобласці). Па вузкакалейках на той час актыўна вывозілі лес. У гады Першай сусветнай вайны ўзводзілася шмат вузкакалеек у раёне лініі фронту. Па іх падвозілі салдат, боепрыпасы, будаўнічыя матэрыялы. Некаторыя з нямецкіх чыгунак захаваліся. Яны выкарыстоўваліся да сярэдзіны 60-х гадоў мінулага стагоддзя, — распавёў Арцём.

Гісторыяй стварэння і развіцця вузкакалейных чыгуначных дарог ён зацікавіўся ў 2008 годзе, калі ўпершыню праехаў у кабіне машыніста. У 2016-м зарэгістраваўся як індывідуальны прадпрымальнік і пачаў арганізоўваць экскурсійныя паездкі, знаёміў людзей з гісторыяй вузкакалейкі, тэхнікай. У сакавіку 2021-га зарэгістраваў прыватную гісторыка-культурную ўстанову па захаванні і папулярызацыі спадчынных чыгунак «Нязведаная вузкакалейка».

***— Чаму вы захапіліся менавіта гэтай тэмай? — пацікавілася ў свайго суразмоўніка.***

— Таму што вузкакалейка — такая загадкавая і таямнічая рэч, якую не сустрэнеш у штодзённым жыцці, яна вызначаецца сваім шармам, прыгажосцю. Усё гэта прыцягвае і мяне, і іншых людзей. Плюс падарожнікі арганічна ўплятаюцца ў дзікую прыроду, што таксама дадае прыгажосці і рамантыкі.

**«Цяпер, з будаўніцтвам Астравецкай атамнай электрастанцыі, ёсць намер перавесці народнагаспадарчы комплекс краіны на электраэнергію. Магчыма, адпадзе і неабходнасць у торфе. І што чакае ў гэтым выпадку вузкакалейкі?»**

***— Інакш кажучы, на шляху можна сустрэць розныя дзівосы? Рэдкіх птушак, расліны, некранутую прыроду?***

— Усе вузкакалейкі ў Беларусі выкарыстоўваюць для вывазу торфу. Яны злучаюць вытворчасць з палямі, праходзячы праз лясы, балоты, дастаткова глухія мясціны, дзе можна назіраць, як раскашуе прырода, бачыць дзікіх жывёлін і птушак, у тым ліку і занесеных у Чырвоную кнігу. Словам, праект з'яўляецца сумессю экалагічнага і прамысловага турызму.

***— Але для арганізацыі такіх экскурсій неабходны добры экскурсавод?***

— Я шмат гадоў збіраў разнастайную гістарычную інфармацыю, літаратуру па вузкакалейках, архіўныя матэрыялы. Такім чынам назапасіў багаж ведаў, што перадаю турыстам. Але цяпер экскурсіі пастаўлены на паўзу, бо займаемся стварэннем турыстычнага маршруту ў Гродзенскім раёне, які будзе праходзіць па тэрыторыі ландшафтнага заказніка «Азёры». Летась закрылася торфабрыкетнае прадпрыемства «Верцялішкі», і заказніку передаюць участак вузкакалейкі працягласцю адзінаццаць кіламетраў, які там праходзіць. На гэтым адрэзку дарогі хочам зрабіць экалагічны маршрут і знаёміць усіх ахвотных з асаблівасцямі заказніка, прыроднымі славутасцямі. Перамяшчацца будзем невялікімі групамі па 5-15 чалавек на мотадрызінах, максімальна зліваючыся з навакольнай прыродай і цішынёй.

Яшчэ пяць гадоў таму ў Беларусі налічвалася каля трыццаці вузкакалеек, цяпер некаторыя пакрысе закрываюцца. Усяго ж засталося прыблізна каля дваццаці двух. А калісьці іх колькасць вымяралася некалькімі сотнямі. Цяпер самая працяглая вузкакалейка Жыткавіцкага торфапрадпрыемства — каля 30 кіламетраў, столькі ж у Дзітве, на Старобінскім торфабрыкетным заводзе — больш як 30.

***— Як вы думаеце, што з цягам часу будзе з вузкакалейкамі, — знікнуць?***

— У нас няма закінутых вузкакалеек, таму што рэльсы дэмантуюць і здаюць на металалом, на пераплаўку, напрыклад, на Жлобінскі металургічны завод. На Сяргеевіцкім торфабрыкетным заводзе была закінутая 15-кіламетровая ветка, якая праходзіла праз незвычайна прыгожыя мясціны, «нанізвала» на сябе дрымучыя лясы, ішла праз засеяныя палі, некранутыя балоты. Была спроба дамовіцца на гэтым участку, якім не карыстаюцца гадоў пяць, сумеснымі намаганнямі зрабіць турыстычны маршрут, знайсці інвестара. Але ўладальнік прапанаваў нам купіць аб'ект, у нас жа няма такіх грошай. У выніку вузкакалейку разабралі.

Гэта была самая маляўнічая ў Беларусі дарога на той момант. У межах аптымальнай для турыстычнага маршруту працягласці — 15 кіламетраў — там было сабрана ўсё: забалочаная тарфянікі, балоты, якія не распрацоўваліся, практычна ў некранутым стане. Тут можна было азнаёміцца з рознымі формамі прыродных, тэхнагенных экасістэм. Але балансаўтрымальнікі вырашылі, што прасцей пусціць яе на металалом.

Дадам, што вузкакалейная чыгунка Сяргеевіцкага торфапрадпрыемства — яе неафіцыйна называюць Рудзенскай вузкакалейкай — знаходзіцца ў Мінскай вобласці.



Фота з адкрытых крыніц.

Сёння яе працягласць — 40 кіламетраў. Яна злучае пасёлкі Рудзенск і Праўдзінскі з торфараспрацоўкамі. Першапачаткова яе працягласць складала каля 90 кіламетраў.

**«Вузкакалейкі — унікальная магчымасць развіваць турыстычную галіну, знаёміць нашых суайчыннікаў з запаветнымі мясцінамі, вучыць берагчы прыроду».**

Увогуле, найбольш буйныя веткі цягнуліся на дзясяткі кіламетраў праз лясы і балоты. Як, напрыклад, сістэма вузкакалейных дарог Смалявіцкай ДРЭС (цяпер Жодзінская ЦЭЦ) — на 165 кіламетраў. Яна злучала станцыю з пяццю торфабрыкетнымі заводамі. А на тэрыторыю Украіны ішла ветка з Івацэвіч, што на Брэстчыне, працягласцю амаль 200 кіламетраў. Ад яе нічога не засталося.

Вузкакалейкі пачалі закрывацца ў канцы 1970-х, калі энергетыку сталі пераводзіць на прыродны газ. Цяпер, з будаўніцтвам Астравецкай атамнай электрастанцыі, ёсць намер перавесці народнагаспадарчы комплекс краіны на электраэнергію. Магчыма, адпадзе і неабходнасць у торфе. І што чакае ў гэтым выпадку вузкакалейкі? Пераплаўка на металалом?

А гэта ж значная частка нашай гісторыі, спадчына, якая б магла паслужыць экалагічнаму, культурнаму выхаванню падрастаючага пакалення, пазнаёміць з дасягненнямі торфаздабыўчай галіны, якую карпатліва выбудоўвалі старэйшыя пакаленні: бацькі, дзяды, прадзеды. Вузкакалейкі — унікальная магчымасць развіваць турыстычную галіну, знаёміць нашых суайчыннікаў з запаветнымі мясцінамі, вучыць берагчы прыроду.

У нашых планах — стварыць музей. Назавём гэта пакуль марай, таму што ў нас няма фінансаў. Яшчэ адна праблема — экспанаты, іх трэба выкупляць па рыначным кошце. Кіраўніцтву прадпрыемстваў прасцей здаць іх на металалом.

***— А якім вы ўяўляеце музей?***

— Уяўляць яго можна па-рознаму. Як я ўжо казаў, мы працуем над экалагічным маршрутам у Гродзенскім раёне. Пакуль гэта будзе адзіны крыты вагон з невялікай экспазіцыяй фотадакументаў, відэаматэрыялаў, нейкіх дробных экспанатаў. Для стварэння паўнацэннага музея ў нашым выпадку павінна быць зацікаўленасць аднаго з прадпрыемстваў, у якога ёсць свая вузкакалейка, узаемадзеянне з «Белпалівагазам».

**«Вузкакалейка — такая загадкавая і таямнічая рэч, якую не сустрэнеш у штодзённым жыцці, яна вызначаецца сваім шармам, прыгажосцю».**

А пакуль ніякага сумеснага ўзаемадзеяння няма. Куды ні звярталіся энтузіясты пісьмова, адусюль адзін адказ — купляйце чыгунку і рабіце на ёй, што хочаце. Можна знайсці розныя варыянты супрацоўніцтва, але жадання з другога боку няма. А ў людзей, нераўнадушных да гэтай справы, адсутнічаюць сродкі, каб набыць цэлыя дарогі, дэпо, цеплавозы.

***— Спрабавалі паўдзельнічаць у нейкіх праектах, каб выйграць грант на развіццё справы?***

— Мы выйгралі «зялёную намінацыю» ў конкурсе сацыяльных праектаў Social Weekend на падрыхтоўку і выраб дрызін для нашага сумеснага з заказнікам «Азёры» праекта вузкакалейна-экалагічнага маршруту, аб якім казалі раней.

Мы гатовыя распрацоўваць праграмы, браць на сябе «раскрутку». Але пакуль няма пад што такія праекты пісаць — паколькі няма пляцоўкі для музея. Кожнаму інвестару спачатку патрэбны нейкі зразумелы план праекта. А нам адмаўляюць нават у спробах нешта зрабіць... У нас няма дамоўленасці ні з адной пляцоўкай, каб паказаць інвестару канкрэтнае месца, паказаць, якім сэнсам мы яго хочам напоўніць, і абгрунтаваць колькасць фінансавых сродкаў, неабходных для ўладкавання музея.

...Зачараванае кола?

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| **Продавец** | **ОАО «Сукно», г. Минск, ул. Матусевича, д. 33. Тел. +375 (17) 363-99-40** |

**Предмет аукциона – уступка исключительных прав на:**

| № лота | Наименование | Начальная цена (без НДС) | Шаг аукциона |
|---|---|---|---|
| 1 | **Товарный знак № 66268**, зарегистрированный в государственном реестре товарных знаков и знаков обслуживания Республики Беларусь (свидетельство о регистрации № 66268, дата регистрации 29.10.2019) | 1 786,66 бел. руб. | 89,33 бел. руб. |
| 2 | **Товарный знак № 64508**, зарегистрированный в государственном реестре товарных знаков и знаков обслуживания Республики Беларусь (свидетельство о регистрации № 64508, дата регистрации 25.02.2019) | 1 497,86 бел. руб. | 74,89 бел. руб. |

**Условия:** безвозмездное пользование указанными товарными знаками при реализации произведенной ОАО «Сукно» продукции до окончания ликвидационного производства, открытого в отношении ОАО «Сукно»

**Дата, время и место проведения аукциона: 21.09.2021 в 14.00**, г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки». Для участия в аукционе необходимо перечислить организатору торгов задаток, а также подать заявление с приложением всех необходимых документов в срок **с 9.00 17.08.2021 до 17.00 17.09.2021** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Порядок ознакомления** | Осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 17.00. Ответственное лицо: Жуковская Татьяна Евгеньевна, контактный телефон +375 (29) 752-08-29 |

Лица, желающие принять участие в аукционе обязаны внести задаток и подать организатору торгов в установленный срок заявление с приложением всех необходимых документов

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Порядок оформления участия в аукционе, критерии выявления победителя торгов и порядок оформления результатов аукциона определяются ст. 127, 128, 129 Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 г. № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)».**
Порядок оформления участия в аукционе: лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона заявление на участие в аукционе с приложением документов согласно ст. 127 выше указанного закона. Критерии выявления победителя аукциона: имущество считается проданным лицу, которое предложило на аукционе самую высокую цену. В случае регистрации или явки на аукцион одного участника (претендент на покупку), предмет аукциона может быть продан данному участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %. Порядок оформления результатов торгов: Победитель торгов (претендент на покупку) в день проведения торгов подписывает протокол

**Срок подписания договора уступки исключительных прав на товарный знак: 15 (пятнадцать) рабочих дней** после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета аукциона**

Победитель аукциона либо претендент на покупку обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором уступки исключительных прав на товарный знак, но не позднее **30 (тридцати) дней** со дня проведения аукциона, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов

Договор подлежит регистрации в патентном органе в порядке, установленном законодательством (ст. 24 Закона РБ от 05.02.1993 г. № 2181-XII (ред.от 18.12.2019) «О товарных знаках и знаках обслуживания»

Победитель аукциона либо претендент на покупку обязан возместить затраты на организацию и проведение аукциона, а также оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере 7 % от цены продажи предмета аукциона в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона. Подробная информация о проведении аукциона размещена на сайте **www.cpo.by**

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06. E-mail: auction@cpo.by** |

